Сямейная газета



## Другую палову шукайце ў танцы



## Музей-тэатр у гудагайскай школе

СТАР. 13



## Французы адзенне выкідаюць, а амерыканцы — падпісваюць

СТАР. 14

ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл МІХАДЗЮК, намеснік міністра энергетыкі:**

*«Сёння многія дзяржавы ўскладаюць надзеі на ядзерную энергетыку як эканамічна эфектыўную і экалагічна чыстую крыніцу, закліканую спрыяць іх устойліваму развіццю. Беларусь таксама зрабіла выбар на карысць ядзернай энергетыкі. Разлічваем, што ў хуткай будучыні каля чвэрці неабходнай краіне электраэнергіі будзе выпрацоўвацца на будучай Беларускай АЭС. Гэта дазволіць гарантаваць стабільныя пастаўкі даступнай па цане і экалагічна чыстай электраэнергіі. Стварэнне новай высокатэхналагічнай ядзернай энергетычнай галіны дае і іншыя пазітыўныя вынікі. Мы ўжо бачым стымулы для развіцця новых вытворчасцяў і, адпаведна, стварэнне працоўных месцаў у розных сферах — ад фундаментальнай навукі да такіх прыкладных галін, як транспарт, машынабудаванне або будаўніцтва».*

ISSN 1990 - 763X

17182>

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 ВЕРАСНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №182 (28546)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# Галоўная задача — абарона



### Прэзідэнт высока ацаніў узровень арганізацыі вучэнняў «Захад-2017»

Фота БЕЛТА.

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з ходам суместнага стратэгічнага вучэння ўзброеных сіл Беларусі і Расіі «Захад-2017» на 227-м агульнавайсковым палігоне «Барысаўскі». Прэзідэнту далажылі аб развіцці ваенна-палітычнага становішча ў Еўрапейскім рэгіёне і яго ўплыве на забеспячэнне ваеннай бяспекі Саюзнай дзяржавы, аб парадку прымянення арміі, у тым ліку ва ўзаемадзеянні з групоўкай войскаў, якая дзейнічае на паўночна-заходнім аператыўным напрамку.**

### Вывучка і ўзровень узраслі

Кіраўнік дзяржавы таксама агледзеў рухомы пункт кіравання камандуючага рэгіянальнай групоўкі войскаў (сіл). Гэты браніраваны аўтамабіль айчыннай вытворчасці абсталяваны самымі сучаснымі сродкамі сувязі, якія дазваляюць кіраваць войскамі непасрэдна ў руху.

— Малайцы! За кароткі прамежак часу зрабілі добрую сістэму, — пахваліў беларускі лідар. Ён таксама ўспомніў, як сам калісьці прымаў удзел у падобных вучэннях.

СТАР. 2

■ Год навукі

# АКЦЭНТ — НА НАВІЗНУ

## Наколькі складана ў нашай краіне стаць кандыдатам і доктарам навук?

**Ці лічыце вы мэтазгодным устанаўленне адзіных патрабаванняў да саіскальнікаў вучоных ступеняў па колькасці апублікаваных навуковых работ незалежна ад галіны навукі? Наколькі мэтазгодна ўстанаўліваць адзіныя патрабаванні да саіскальнікаў вучонага звання «прафесар» незалежна ад месца іх працы — у ВНУ, установе дадатковай адукацыі ці навуковай арганізацыі? Ці трэба ствараць аб'яднаныя саветы па абароне дысертацый на базе дзвюх і больш устаноў адукацыі і (ці) навуковых арганізацый? На гэтыя і іншыя пытанні анкеты прапанавалі адказаць удзельнікам міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прымеркаванай да 25-годдзя Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь.**

### НЕПРАДУЗЯТАСЦЬ І АБ'ЕКТЫЎНАСЦЬ

— Сёння на абмеркаванне прафесіяналаў вынесены пытанні, якія былі сфармуляваны па прагу апошніх гадоў работы ВАК. Але ўсе змяненні ў заканадаўчую базу будуць уносіцца толькі пасля іх узгаднення з навуковай грамадскасцю і ні ў якім разе не адміністрацыйна, — запэўніў **старшыня ВАК, доктар педагагічных навук, прафесар Генадзь ПАЛЬЧЫК.** — У гэтым мы аднадумцы.

На 1 верасня ў сістэме дзяржаўнай атэстацыі навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі былі задзейнічаны па краіне 1496 доктароў навук, 86 акадэмікаў і 114 членаў-карэспандэнтаў Нацыянальнай акадэміі навук. У краіне дзейнічалі 162 саветы па абароне дысертацый (100 з іх — пры ўстановах вышэйшай адукацыі) і 29 экспертных саветаў.

Дарэчы, найбольшая колькасць званняў «доктар навук» і «кандыдат навук» (17,6% ад агульнай колькасці) прысуджалася з 1994 па 2017 год у галіне тэхнічных навук, на другім і трэцім месцы ідуць медыцына (16,1%) і фізіка-матэматычныя навукі (10,2%).

— На жаль, летась у нас адбылося рэзкае зніжэнне колькасці абароненых работ па тэхнічных навуках — амаль на 30 працэнтаў. Гэта трывожны сігнал, таму што калі мы хочам мець канкурэнтаздольную эканоміку, то нам патрабуецца магутны кандыдацкі корпус, асабліва па высокатэхналагічных спецыяльнасцях, якія б сталі падмуркам для фарміравання новых навуковых школ, — падкрэсліў Генадзь Пальчык.

Але якія ж сёння прад'яўляюцца патрабаванні да саіскальніка вучонай ступені доктара навук? У гуманітарных навуках прэтэндэнт павінен мець не менш як 15 апублікаваных артыкулаў і адну рэцэнзаваную аднаасобную манаграфію. У медыцынскіх і сельскагаспадарчых навуках — ужо не менш як 22 артыкулы ці 15 артыкулаў і адну рэцэнзаваную манаграфію. У прыродазнаўчых і тэхнічных навуках — не менш як 25 артыкулаў ці 18 артыкулаў і адну рэцэнзаваную манаграфію. Адкуль такая розніца ў падыходах? І чаму б у тэхнічных навуках, не зніжаючы патрабаванняў да якасці дысертацыйных работ, не залічваць саіскальнікам, напрыклад, замест артыкулаў патэнты і пасведчанні на вынаходніцтвы і тэхналогіі? А ў педагагічных навуках — напісаныя саіскальнікам падручнікі ці ўкаранёныя ў педагагічную практыку аўтарскія метадыкі выкладання і выхавання?

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ЛЯДОЎНЮ АБО ВЯНДЛЯРНЮ

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# Галоўная задача — абарона



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Я ўжо другі раз прымаю ўдзел у вучэннях «Захад». Тады гэта былі «Захад-81». Зусім маладым лейтэнантам мне прыходзілася ў іх удзельнічаць. Я параўноўваю тыя вучэнні і цяперашнія. Вывучка і ўзровень значна ўзраслі. Вы зусім іншыя салдаты і афіцэры, але мэты ў нас тыя ж: абараніць незалежнасць нашых дзяржаў, абараніць нашы нацыянальныя інтарэсы і проста абараніць нашы сем'і. Мы нікому не пагражалі і пагражаць не збіраемся. З нашых земляў не сыходзілі пагрозы і войны, але той, хто прыходзіў на гэту зямлю, заўсёды атрымліваў годны адпор. Гэта ідэалагічны складнік нашых вучэнняў.

Падчас вучэнняў праходзілі апрабацыю новыя ўзоры ўзбраення і ваеннай тэхнікі абароннага сектара эканомікі Беларусі: лёгкабраняваныя аўтамабілі «V1» (МЗКЦ), бронетранспарцёр «Кайман», радыёэлектронныя стрэльбы для барацьбы з мульцікоптарамі (ААТ «КБ Радар»), а таксама мадэрнізаваныя танкі Т-72 БМЗ.

Аляксандр Лукашэнка ўчора выказаўся па шэрагу пытанняў абарончай тэматыкі.

## ...Пра ўдзел Уладзіміра Пуціна

Прэзідэнты Беларусі і Расіі вызначыліся з раздзельным удзелам у вучэннях «Захад-2017».

— Мы дамовіліся, што паколькі ўсё-такі асноўная фаза сапраўды тут (у Беларусі. — **Заўв. аўт.**), але вельмі буйныя вучэнні праходзілі якраз у Ленінградскай вобласці, то Прэзідэнт Расіі пракантралюе і будзе назіраць за вучэннямі на поўначы, а я — ужо ў цэнтры, — заявіў кіраўнік дзяржавы.

У той жа час была ідэя сумеснай прысутнасці прэзідэнтаў на вучэннях:

— Але па ходзе вызначыліся, што нам усё ж такі трэба больш шырока ахапіць гэта вучэнне, каб людзі бачылі прэзідэнтаў — дзе яны працуюць, як, — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

## ...Пра спробу дыскрэдытацыі мерапрыемства

На думку Прэзідэнта, яна была крайне непрафесійнай. Тым, хто рабіў спробы дыскрэдытацыі беларуска-расійскіх вучэнняў, кіраўнік дзяржавы параіў «хоць бы навучыцца гэта рабіць па-сапраўднаму». Ён падкрэсліў, што пры колькасці беларускай арміі ў 75 тысяч прысутнасць некалькіх тысяч расійскіх вайскоўцаў у Беларусі нічога б не змяніла.

Што да асцярог з боку шэрагу заходніх палітыкаў і вайскоўцаў, маўляў, не ўсе расійскія войскі могуць быць выведзеныя з тэрыторыі Беларусі, Аляксандр Лукашэнка заявіў:

— Я з задавальненнем пракаментую гэта праз некаторы час, калі ўсе войскі, якія былі прыцягнутыя на вучэнні, будуць у месцах пастаяннай дыслакацыі, у тым ліку і расійскія.

## ...Пра абарону нацыянальных інтарэсаў

— Мы ўсяляк падтрымліваем неабходны ваенны патэнцыял і сумесна прымаем меры па прадухіленні ваенных пагроз Беларусі і Расіі, удасканаленні функцыянавання рэгіянальнай групоўкі войскаў. Пры гэтым сумесная ваенная дзейнасць і супрацоўніцтва з Расіяй у правядзенні вучэнняў не скіраваныя супраць трэціх краін і служаць выключна абароне нашых нацыянальных інтарэсаў, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У гэтым, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, змаглі пераканацца прадстаўнікі ваенна-дыпламатычнага корпуса і шматлікіх міжнародных арганізацый, прысутныя на завяршальным этапе вучэння.

## ...Пра якасць вучэнняў

Прэзідэнт аб'явіў падзяку ўсяму асабоваму складу, які прыняў удзел у сумесным стратэгічным вучэнні «Захад-2017» на беларускай тэрыторыі. Кіраўнік дзяржавы павіншаваў ваеннаслужачых з паспяховым завяршэннем вучэнняў і пажадаў ім далейшых поспехаў у ратнай працы па надзейным забеспячэнні бяспекі і мірнай працы двух брацкіх народаў.

— Вучэнні праведзены згодна з зацверджанай задумай, пастаўленыя мэты дасягнуты, вучэбныя пытанні адпрацаваны з добрай якасцю. На належным узроўні вырашаны задачы па сумеснай абароне ва ўмовах сучасных выклікаў і пагроз бяспекі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Падчас размовы з прадстаўнікамі СМІ кіраўнік дзяржавы выказаў словы ўдзячнасці ўсім журналістам, якія, па яго словах, проста бліскуча адпрацавалі гэтыя вучэнні як на этапе падрыхтоўкі, так і на этапе правядзення.

— Павінен прама сказаць, што мэты, якія пастаўлены ў шырокім плане перад вучэннямі, былі рэалізаваны не толькі на беларускіх палігонах, але і на расійскіх. Усе элементы вучэння мы адпрацавалі. Вынікі мы яшчэ падвядзём больш канкрэтна, але ў цэлым задачы вырашаны, — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Гаворачы аб правядзенні вучэнняў, Прэзідэнт падкрэсліў, што лепш нешта дэманстраваць, чым ваяваць.

— Мы ні ад каго не хавалі гэтую дэманстрацыю, паказалі здольнасць узброеных сіл Расіі і Беларусі па абароне саюза і інтарэсаў нашых дзяржаў, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта сапраўды была дэманстрацыя нашых магчымасцяў, без гэтага нельга.

## ...Пра мадэрнізацыю ВПК

Яна будзе працягнута. Пры гэтым, распрацоўваюцца і новыя ўзоры ўзбраення.

Адным з кірункаў развіцця арміі і яе тэхнічнага абсталявання кіраўнік дзяржавы назваў глыбокую мадэрнізацыю ўзбраення і тэхнікі, якія ўжо ёсць. Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што неабавязкова закупляць дарагія новыя ўзоры за мільёны долараў, калі магчыма мадэрнізаваць тое, што ўжо маецца, і атрымаць супараўнальныя характарыстыкі.

— Мы гэта ўмеем рабіць — і лятальныя апараты, і бранятэхніку, і стралковую зброю, — звярнуў увагу Прэзідэнт.

У Беларусі ўдалося захаваць прадпрыемствы і школы ў сферы ВПК, і яны запатрабаваныя:

— Па ўсіх кірунках мы навучыліся рабіць і будзем пашыраць гэты спектр. Не толькі таму, што трэба ўзброіць нашу армію, — у свеце вельмі вялікі попыт на глыбокую мадэрнізацыю, стварэнне новай тэхнікі. Тое, што мы ўмеем, не толькі выраблялем для сябе, але і паспяхова прадаём на міжнародных рынках.

Што да новых відаў узбраення, то ў першую чаргу гэта ракетная сістэма «Паланэз» і айчынныя бронемашыны. Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу, што работа вядзецца перш за ўсё па тых узорах тэхнікі, якія могуць быць запатрабаваныя ва ўмовах сучасных ваенных канфліктаў.

— Вайна не будзе фронт на фронт. Будуць лакальныя баі. Нам для абароны патрэбныя вельмі рухомыя часці, і апошнія войны ў свеце арыентуюць нас на тое, каб мы мелі мабільныя падраздзяленні, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.



Фота БЕЛТА.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

*yushkevich@zviazda.by*

# ПАДАТКІ БЕЗ ПАМЫЛАК І ШТРАФАЎ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ №338 «Аб падатковым кансультаванні», які ўкараняе ў краіне прафесійны інстытут пасярэднікаў паміж бізнесам і падатковымі органамі.**

Інстытут падатковых кансультантаў ствараецца ў Беларусі з улікам станоўчага замежнага вопыту: ён запатрабаваны і паспяхова функцыянуе ў многіх еўрапейскіх краінах, у тым ліку ў Аўстрыі, Германіі, Польшчы, Францыі, Чэхіі і іншых дзяржавах, адзначаюць у прэс-службе Прэзідэнта. Правам аказання такіх паслуг надзяляюцца індывідуальныя прадпрымальнікі і камерцыйныя арганізацыі, якія маюць у сваім штаце як мінімум аднаго падатковага кансультанта. Пры гэтым працаваць на такой пасадзе спецыяліст зможа пасля здачы кваліфікацыйнага экзамену ў Міністэрстве па падатках і зборах і атрымання атэстата падатковага кансультанта.

Акрамя кансультавання гэтыя спецыялісты будуць мець права аказваць паслугі па вядзенні бухгалтарскага і падатковага ўліку, складанні справаздачнасці, прадстаўленні інтарэсаў кансультуемых асоб у дзяржаўных органах і арганізацыях. Зварот да падатковых кансультантаў будзе насіць выключна добраахвотны характар і ні ў якім выпадку не будзе навязвацца прадпрымальнікам і арганізацыям.

У адпаведнасці з дакументам на падатковых кансультантаў ускладаецца поўная матэрыяльная адказнасць за якасць і вынік іх дзейнасці, а магчымыя рызыкі прычынення шкоды падлягаюць абавязковаму страхаванню.

Выданне Указа будзе садзейнічаць правільнаму падліку суб'ектамі гаспадарання падаткаў, дазволіць знізіць верагоднасць здзяйснення падатковых правапарушэнняў, мінімізаваць выдаткі бізнесу па выплаце пеняў і штрафаў за згаданыя парушэнні.


**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает об открытом аукционе по продаже незавершенного строительством законсервированного капитального строения, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 72/ 2**

Лот №1. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. №500/U-63358. Назначение: здание неустановленного назначения. Общая площадь – 11 404 кв. м. Фундамент – монолитный ж/бетон; стены – монолитный ж/бетонный каркас; перекрытия – ж/бетонные ребристые плиты; кровля – эксплуатируемая из бетонных плит; строительная готовность – 54%.
**Начальная цена продажи — 1 347 840,00 бел. руб. Задаток — 134 780,00 бел. руб. Шаг аукциона — 5%**

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ

Земельный участок с кадастровым номером 500000000007002866, расположенный по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 72, пл. 1,3612 га. Назначение – для строительства и обслуживания центра по продаже легковых автомобилей «Опель». На земельном участке находятся иные объекты, не выставляемые на аукцион.
Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
ОБРЕМЕНЕНИЯ: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, пл. 0,0675 га, охранная зона сетей и сооружений канализации, пл. 0,0675 га

ОБРЕМЕНЕНИЯ

1. Арест. Постановление ИМНС Республики Беларусь по Центральному району г. Минска от 01.06.2015 №1110476 АА. Арест будет снят в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь после реализации Объекта с публичных торгов (торгов).
2. Запрещение. Запрет на основании постановления УПИ ГУЮ Мингорисполкома от 11.06.2015 №б/н.
3. Арест. Постановление ОПИ Центрального района г. Минска от 14.09.2015 №б/н.
4. Арест. Постановление ИМНС Республики Беларусь по Центральному району г. Минска от 03.03.2017 №1110656. Арест будет снят в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь после реализации Объекта с публичных торгов (торгов)

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), (Претендент на покупку) обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество должника, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 24.10.2017 г. в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4. Шаг аукциона — 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X.
Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот №1), проводимом 24.10.2017 (Фрунзенский МРО).
Организация и проведение аукциона, а также оформление и регистрация сделки осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 20.10.2017 в 11.00.
Все желающие могут ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: директор ОДО «Инградо» Куницкий Марк Анатольевич, тел. +375 29 655-55-75.

Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by

Минский филиал РУП «Белпочта» приглашает принять участие в переговорах по выбору подрядной организации для выполнения работ объекту «Текущий ремонт кровли здания ОПС Ухвала Борисовского РУПС по адресу: а. г. Ухвала, ул. Ленинская, 9». Переговоры состоятся 29.09.2017 года по адресу: г. Минск, ул. Воронянского, д. 5, корп. 3. Источник финансирования работ – собственные средства предприятия. По всем вопросам обращаться по тел. 264-83-66 – начальник отдела СР и ХО Иванов И. В.

УНП 101120215

■ На кантролі

# Грошы затрымаліся ў «сетках»

**Кіраўнікі Міністэрства прамысловасці і буйных беларускіх кампаній зрабілі справаздачу ў Генеральнай пракуратуры па пытаннях скарачэння знешняй пратэрмінаванай дэбіторскай запазычанасці і вяртання валютнай выручкі ў краіну.**

На нарадзе з удзелам генеральнага пракурора Аляксандра Канюка прысутнічалі кіраўнікі найбуйнейшых экспартаарыентаваных кампаній краіны: «Белнафтахіма», МТЗ, МАЗа, «Белшыны», «Мінаблмясамалпрама». На парадку дня — абмеркаванне сістэмных парушэнняў у дзейнасці беларускіх вытворцаў па кіраванні таваправоднымі сеткамі, якія застаюцца адной з асноўных крыніц знешняй пратэрмінаванай дэбіторскай запазычанасці.

Аляксандр Канюк нагадаў удзельнікам нарады аб даручэнні Прэзідэнта трымаць на пастаянным кантролі згаданыя пытанні. Генпракурор падкрэсліў, што спецыялісты падышлі да выканання гэтага даручэння шматвектарна. Ужо распрацаваны метадычныя рэкамендацыі, накіраваныя на выключэнне рызык нявыплаты, у абарону інтарэсаў беларускіх прадпрыемстваў. Не абышлося без шэрагу крымінальных спраў. Таксама наладжана міжнароднае супрацоўніцтва. У мэтах ліквідацыі выяўленых парушэнняў толькі ў першым паўгоддзі сёлета пракурорамі быў вынесены 51 акт нагляду, 61 чалавек быў прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці, 13 — да матэрыяльнай. Дзякуючы гэтаму, у гаспадарчы абарот прадпрыемстваў атрымалася вярнуць суму, эквівалентную 100 млн долараў ЗША.

«Гэтае пытанне вельмі сур'ёзнае — на ўзроўні бяспекі краіны. Але разам з тым сума пратэрмінаванай дэбіторскай запазычанасці ўсё яшчэ вельмі вялікая — каля 500 млн долараў. Гэтая нарада і тая, што адбудзецца на наступным тыдні ў Маскве, дзе мы будзем гутарыць з прадстаўнікамі таваправодных сетак, дасць магчымасць лепш зразумець сітуацыю», — растлумачыў журналістам Аляксандр Канюк.

Паводле яго слоў, пракуратура не выпускае з-пад увагі тое, што ў бізнесе бываюць розныя рызыкоўныя сітуацыі. «Але, калі гаворка ідзе аб здзелцы, якая заключаецца з мэтай махлярства, калі рызыкі становяцца карупцыйнымі, то справа набывае іншы кірунак, — падкрэсліў генеральны пракурор.

На яго погляд, адна з праблем — адсутнасць кантролю з боку прадпрыемстваў за сваімі суб'ектамі таваратправодных сетак. Часта іх дзейнасць не звязана з палітыкай прадпрыемстваў. «Нам трэба расказваць пра гэта. А кампаніі ўжо выбудоўць сваю сістэму кантролю», — рэзюмаваў Аляксандр Канюк.

У мерапрыемстве таксама прынялі ўдзел намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Мікалай Снапкоў, намеснік дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Андрэй Уцюрын, старшыня Следчага камітэта Іван Наскевіч, намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Уладзімір Кухараў і прадстаўнікі шэрагу міністэрстваў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

■

## УВАГА: ПРАМАЯ ЛІНІЯ

### Усё, што вы хацелі даведацца аб працоўным праве

**Што лічыцца зменай умоў працы і ці павінен работнік пры гэтым распісвацца ў дадатковым пагадненні? Што рабіць, калі працадавец адмаўляецца своечасова разлічыць работніка пры яго звальненні? Як перайсці з кантрактнай формы найму на бестэрміновы працоўны дагавор? Які мінімальны тэрмін трэба адпрацаваць жанчыне да выхаду ў новы дэкрэт? Ці павінен працадавец выплаціць выхадную дапамогу пры скарачэнні пенсіянера? Ці можна пасля дасягнення дзіцем трох гадоў заставацца з ім дома, але захаваць за сабой працоўнае месца?**

Гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце задаць, патэлефанаваўшы на прамую лінію гасцям рэдакцыі «Звязды» — юрыстам, **галоўнаму прававому інспектару працы Цэнтральнага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларысе Васілеўне МАНЮК і галоўнаму прававому інспектару працы Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Сафіі Васілеўне ГРЫШУЦІНАЙ**.

Тэлефануйце **25 верасня з 11.00 да 13.00** па тэлефоне **8 (017) 287-18-71**.

Папярэднія пытанні можаце задаць 21 і 22 верасня па тэлефоне 8 (017) 287-18-29 у працоўны час або даслаць (з пазнакай «Прамая лінія») на электронны адрас info@zviazda.by або па пошце: вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск.

■ На слыху

# БЛУКАЎ ПЯЦЬ ДЗЁН

...70-гадовы магіляўчанін Дзмітрый Нікіценка. 14 верасня ён пайшоў у грыбы са свайго дачнага дома, што ў вёсцы Залессе Магілёўскага раёна, і знік. У пошуках прымалі ўдзел міліцыянеры, ратавальнікі, работнікі лягсаса і шмат іншых неабыякавых людзей. Але знайсці чалавека пашчасціла непасрэдна супрацоўнікам Магілёўскага раённага аддзела ўнутраных спраў — **начальніку аддзялення вышуковай работы аддзела крымінальнага вышуку падпалкоўніку міліцыі Алегу БЫЧКОВУ, оперупаўнаважанаму гэтага ж аддзялення маёру міліцыі Паўлу АХРАМОВІЧУ і міліцыянеру-кіроўцу старшыне міліцыі Руслану ГУЛАКОВУ.** Яны наткнуліся на грыбніка непадалёк ад вёскі Навасёлкі Вендаражскага сельсавета — прыкладна за сем кіламетраў ад таго месца, дзе пенсіянер першапачаткова зайшоў у лес.

— Мужчына ляжаў на зямлі, быў вельмі аслаблены, на мясцовасці не арыентаваўся. Мы паклапаціліся, каб як мага хутчэй перадаць яго ў рукі медыкаў, — удакладніў Алег Бычкоў.

Пасля двух дзён блуканняў па лесе адшукалася і 88-гадовая жыхарка Краснапольскага раёна Вера Карпенка. Знайсці дарогу дадому ёй дапамаглі супрацоўнікі Краснапольскага РАУС. На здзіўленне жанчына адчувала сябе добра і ў шпіталізацыі не мела патрэбы.

У Магілёўскай вобласці пошукамі грыбнікоў у гэтым сезоне займаюцца не ўпершыню. Заблукалы 68-гадовы магіляўчаніну гэта наогул каштавала жыцця — не вытрымала хворае сэрца.

Супрацоўнікі міліцыі раяць аматарам ціхага палявання быць больш адказнымі за свае паводзіны ў лесе, папярэджваць родных, па магчымасці браць з сабой спадарожніка. Апранацца трэба ў яркую вопратку, мець пры сабе запас вады, нож, запалкі і мабільны тэлефон, які павінен быць цалкам зараджаны.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*



# ПЕНСІЯНЕРА ВЫНЕСЛІ З ЛЕСУ НА РУКАХ

### А пошукі хлопчыка ў пушчы пакуль плёну не далі...

Па інфармацыі прэс-службы УУС Гродзенскага аблвыканкама, жыхар пасёлка Дзітва Лідскага раёна выправіўся ў лес у грыбы 18 верасня. У нейкі момант 68-гадовы мужчына зразумеў, што заблудзіўся. Ён патэлефанаваў сваякам і расказаў, дзе пакінуў машыну і ў які бок накіраваўся. У міліцыю паведамленне аб зніклым чалавеку паступіла каля 22 гадзін. Да таго часу тэлефон мужчыны разрадзіўся. На пошукі адправіліся супрацоўнікі роты патрульна-паставой службы Лідскага РАУС. Сітуацыю ўскладнялі дрэнное надвор'е і цемра, а таксама рызыка наткнуцца на багну. Міліцыянеры некалькі разоў прачасалі лес, кожны раз упіраючыся ў балота. А палове другой ночы пачулі крыкі чалавека. Мужчына моцна змерз і сам перасоўвацца не мог. Супрацоўнікі міліцыі вынеслі яго з лесу на руках.

А вось пошукі зніклага ў Белавежскай пушчы 10-гадовага жыхара вёскі Новы Двор Свіслацкага раёна працягваюцца. У іх удзельнічаюць некалькі сотняў чалавек з навакольных рэгіёнаў і сталіцы. Максім Мархалюк знік яшчэ ў суботу 16 верасня — ён адправіўся ў лес у грыбы і знік. Пазней у пушчы былі знойдзены яго веласіпед і пакет. У цяперашні час у пошукавых мерапрыемствах у Белавежскай пушчы прымаюць удзел супрацоўнікі міліцыі, МНС і валанцёры. Зона пошуку дзіцяці лакалізаваная да радыуса ў 40 кіламетраў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# МІНА ЗАПАВОЛЕНАГА ДЗЕЯННЯ

У верасні толькі гультай не пабываў у лесе, які радуе багатым ураджаем грыбоў. Аднак, як паказваюць даследаванні Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, не ўсе яны прыдатныя для ежы. Значнае перавышэнне радыенукліду цэзію-137 выяўляецца ў грыбах, сабраных у лясах Валожынскага раёна. Удзельная актыўнасць гэтага рэчыва ў адабраных для праверкі пробах перавышала 1500 Бк/кг. Дапушчальны ўзровень — не больш як 370 Бк/кг. Такія дары прыроды ні ў якім разе нельга ўжываць у ежу, раяць спецыялісты, а грыбы з валожынскіх лясоў трэба абавязкова правяраць у лабараторыях. А таксама папярэджваюць, што ў лес у ваколіцах Івянца і ў Налібоцкую пушчу на «ціхае паляванне» наогул лепш не хадзіць.

У той жа час, як засведчыў лабараторны аналіз, утрыманне радыенукліду цэзію-137 у лясных «трафеях» з масіваў Уздзенскага, Мінскага, Крупскага, Дзяржынскага раёнаў Мінскай вобласці не перавышала дапушчальныя нормы.

Праверыць грыбы можна ў радыелагічнай лабараторыі цэнтра, які знаходзіцца ў Мінску па вуліцы П. Броўкі, а таксама ў занальных цэнтрах гігіены і эпідэміялогіі, акрамя Смалявіцкага раёна. Для насельніцтва гэтая паслуга бясплатная.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

■

# МАЙСТЭРСТВУ ВУЧАЦЬ МЭТРЫ ЖУРНАЛІСТЫКІ

**Сёння ў Гродне на базе рэдакцыі «Гродзенскай праўды» будзе распачаты творчы праект «Школа журналістыкі «Майстэрня BY-RU». Арганізатары — Беларускі саюз журналістаў і супольнасць журналістаў Беларусі і Расіі «Друзья-Сябры» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта.**

Навучанне разлічана на цэлы год. Вынікі арганізатары школы, заняткі якой нязменна будуць праходзіць у Гродне, падвядуць у маі 2018 года. У праграме заняткаў — сустрэчы, семінары, мэтай якіх з'яўляецца павышэнне прафесійнай кваліфікацыі журналістаў, рэдактараў, менеджараў, PR-спецыялістаў, стварэнне сучасных якасных інфармацыйных прадуктаў. Выкладчыкамі ў «Майстэрні BY-RU» стануць вядомыя ў Беларусі і Расіі журналісты.

— Мы разлічваем, што да заняткаў у нашай школе прыцягнецца маладая калегі з розных куткоў нашай краіны, — выказвае ўпэўненасць адзін з мадэратараў праекта, кандыдат гістарычных навук Вадзім Гігін.

**Сяргей ШЫЧКО.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Трамп: ЗША будуць вымушаны цалкам знішчыць КНДР у выпадку пагрозы

Злучаным Штатам у выпадку пагрозы для саміх сябе або для сваіх саюзнікаў прыйдзецца «цалкам знішчыць» КНДР. Пра гэта, выступаючы ў ходзе агульнапалітычнай дыскусіі на Генеральнай Асамблеі ААН, заявіў прэзідэнт ЗША Дональд Трамп.

Ён падкрэсліў, што Вашынгтон гатовы гэта зрабіць, выказаўшы надзею на тое, што гэтага не адбудзецца.

Трамп таксама падзякаваў Расіі і Кітаю за тое, што яны падтрымалі новыя санкцыі ААН супраць Пхеньяна, заклікаўшы пры гэтым актывізаваць гэтыя намаганні. «Дзякуй усім, хто ўдзельнічаў, але мы павінны зрабіць больш», — адзначыў ён. «Абуральна, што некаторыя краіны не толькі вядуць гандаль з такім рэжымам, але таксама пастаўляюць яму зброю і падтрымліваюць яго фінансава», — дадаў амерыканскі кіраўнік.

Прэзідэнт ЗША ізноў назваў лідара КНДР Кім Чэн Ына «чалавекам-ракетай», які праводзіць самагубную палітыку. «Паўночнай Карэі час прызнаць, што дэнуклеарызацыя — гэта адзіная прымальная будучыня», — дадаў ён.

### Разбуральнае землетрасенне ў Мексіцы



Колькасць загінулых у выніку магутнага землетрасення ў Мексіцы ўзрасла да 258. Пра гэта паведаміў кіраўнік нацыянальнай аварыйна-выратавальнай службы Луіс Фэліпэ Пуэнтэ. Раней паведамлялася пра 149 загінулых. Каля 4,6 мільёна людзей засталіся без электрычнасці. У Мехіка на працягу некалькіх гадзін не працавала мабільная сувязь. Улады абвясцілі ў сталіцы рэжым надзвычайнага становішча.

Землятрус магнітудай 7,1 бала здарыўся на паўднёвым усходзе Мексікі 19 верасня ўвечары. Затым адбылося больш за 10 афтэршокаў. Падземныя штуршкі разбурылі больш за 40 будынкаў у Мехіка. Як перадае The Guardian, падчас землятрусу абвалілася царква, размешчаная на схілах вулкана Папакатэпетль. Там у гэты час праходзіла служба, 15 чалавек загінулі.

Мексіканскія сейсмолагі зараз ацэньваюць сітуацыю на вулкане як «чырвоную трывогу» — адзін з найвышэйшых узроўняў небяспекі, перадае «Інтэрфакс». Пакуль, зрэшты, вулкан толькі выкідвае слупы дыму.

### У бельгійскіх водах Паўночнага мора знайшлі падлодку часоў Першай сусветнай вайны з загінулай камандай унутры

У Паўночным моры на захадзе Бельгіі каля порта Астэндэ знойдзена нямецкая падводная лодка даўжынёй 27 метраў і шырынёй пяць метраў часоў Першай сусветнай вайны, як мяркуецца, з целамі членаў экіпажа, піша газета De Standaart.

Падлодка знаходзіцца на глыбіні каля 30 метраў. Яе дакладнае месцазнаходжанне не абнародуецца, каб туды не трапілі аматары, якія могуць пашкодзіць знаходку.

У такіх падлодках звычайна былі 22 члены экіпажа і камандзір. Вучоныя мяркуюць, што цэлы маракоў яшчэ знаходзяцца ўнутры. «Усе люкі зачыненыя. Гэта паказвае на тое, што лодка не была выяўлена раней, і на тое, што 23 чалавекі з загінулага экіпажа ўсё яшчэ знаходзяцца там», — паведаміў кіраўнік экспедыцыі Дэкалувэ. Прычыны крушэння невядомыя, аднак характар пашкоджанняў на насавой частцы паказвае на тое, што лодка падарвалася на міне. Даследчыкі мяркуюць, што гаворка ідзе пра падлодку UB-II, якія будаваліся ў 1915—1916 гадах і маглі апускацца на глыбіню каля 50 метраў.

# АКЦЭНТ — НА НАВІЗНУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Старшыня ВАК лічыць, што трэба разгледзець магчымасць стварэння спецыялізаваных саветаў па абароне дысертацый пад канкрэтную работу з прыцягненнем вучоных не толькі з нашай краіны, але і замежных спецыялістаў у рэжыме анлайн.

— Увогуле ў забеспячэнні адкрытасці працэдуры абароны работ трэба арыентавацца на досвед суседзяў, якія арганізуюць трансляцыю абароны ў рэжыме анлайн, — падкрэсліў Генадзь Пальчык. — Я мяркую, гэта ў нашых інтарэсах, каб нас не абвінавачвалі ў прадузятасці і неаб'ектыўнасці. Мы гатовы праводзіць пасяджэнні і экспертных саветаў, і Прэзідыума ВАК у рэжыме анлайн.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## А ХТО НА «ЛАЎЦЫ ЗАПАСНЫХ»?

Для нашай краіны праблема старэння навуковых кадраў найвышэйшай кваліфікацыі ў сферы педагогікі актуальная як ніколі. За перыяд з 2006 па 2017 год у педагогіцы былі абаронены ўсяго 16 доктарскіх дысертацый. Дактароў педагагічных навук ва ўзросце 70 гадоў і старэйшым у нас 74% ад агульнай колькасці. Добра, што яны яшчэ працягваюць працаваць і падтрымліваюць статус і айчыннай педагагічнай навукі, і ВНУ, у якіх яны выкладаюць. Перад новым навучальным годам дактары педагагічных навук былі ў рэктараў нарасхват...

**Найбольшая колькасць званняў «доктар навук» і «кандыдат навук» (17,6% ад агульнай колькасці) прысуджалася з 1994 па 2017 год у галіне тэхнічных навук.**

— На цяперашні момант у педагагічнай галіне зацверджаны і распрацоўваюцца 24 тэмы доктарскіх дысертацый і 200 тэм кандыдацкіх, — паведаміў **доктар педагагічных навук, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Вадзім ЯКАНЮК.** — Але тэматыка фарміруецца ў многім выпадкова. Зразумела, што ёсць прафесійныя і творчыя інтарэсы саіскальнікаў, але яны ўсё ж такі павінны неяк карэляваць з сённяшняй сітуацыяй і патрэбамі. Так, у сферы прафесійнай адукацыі распрацоўваюцца толькі чатыры тэмы доктарскіх работ, і гэта пры вялізнай колькасці спецыяльнасцяў у вышэйшай школе! Фарміраванне навуковай праблематыкі — сур'ёзная праблема. Разам з тым, нягледзячы на наяўнасць аб'ектыўных цяжкасцяў, патэнцыял айчыннай педагагічнай навукі ў поўнай меры не запатрабаваны. Найважнейшыя рашэнні ў адукацыі нярэдка прымаюцца без правядзення сацыяльна-педагагічных даследаванняў і шырокага прыцягнення навукова-педагагічнай грамадскасці. Узяць той жа Балонскі працэс. Гэта была выдатная пляцоўка для дыскусій, якой мы за 20 гадоў так і не скарысталіся, у нашай краіне не было праведзена ніводнага даследавання па гэтай тэме, а потым узялі і проста да яго далучыліся. Не праводзяцца ў краіне і рэспубліканскія сацыяльна-педагагічныя даследаванні, якія б распрацоўвалі тэмы маральнасці, патрыятызму, каштоўнасная арыентацыі асобы.

— Вартасць кандыдацкай і доктарскай дысертацыі заключаецца не толькі ў глыбіні вывучэння матэрыялу, але і ў статусе самой праблемы, гэта значыць, што **праблема не павінна быць дробнай для дысертацыі,** — упэўнена **доктар філалагічных навук, прафесар Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава Валянціна МАСЛАВА.** — Трэба арыентавацца на апошнія тэндэнцыі. Для сучаснай навукі, а для гуманітарнай асабліва, уласцівы сінтэз навуковых ведаў. Некаторыя вучоныя бачаць будучыню навукі ў аб'яднанні гуманітарных і прыродазнаўча-навуковых ведаў, у сінтэзе навуковага, філасофскага, мастацкага і рэлігійнага падыходаў. У такую складаную вобласць даследавання, як мова, свой уклад павінны ўнесці прадстаўнікі многіх навук: ад малекулярнай біялогіі, генетыкі, нейрафізіялогіі, псіхалогіі да нейралінгвістыкі і аналітычнай філасофіі. Патрабуецца супрацоўніцтва не проста вучоных з розных навуковых галін, а падрыхтоўка спецыялістаў полідысцыплінарнага тыпу.

Валянціна Маслава звярнула ўвагу на тую акалічнасць, што **мова аўтараў многіх дысертацый вылучаецца незразумеласцю выкладання, празмернай колькасцю замежнай лексікі,** прычым маецца на ўвазе не тэрміналогія, якая мае, як правіла, замежнае паходжанне, хоць праблема тэрміналагічнай перагружанасці таксама існуе: «Пры чытанні такіх дысертацый нярэдка ўзнікае заканамернае пытанне, а ў якой краіне мы знаходзімся: у Англіі, ЗША ці ўсё ж такі ў Беларусі?»

## ЧАМУ СТО ЛЕПШ ЧЫМ ДЗВЕСЦЕ?

Праблемамі напісання і абароны дысертацыйных работ у эканамічнай сферы падзяліўся **доктар эканамічных навук прафесар Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Віктар ВАРАБ'ЁЎ:**

— Па-ранейшаму ў нас мала абараняецца доктарскіх дысертацый, а гэта абвастрае праблему натуральнага старэння дактароў эканамічных навук. Асобныя дысертацыйныя даследаванні слаба звязаны з дзяржаўнымі праграмамі развіцця эканомікі. Атрыманыя ж вынікі не маюць ярка выражанага эканамічнага і сацыяльнага эфекту. Часта парушаецца логіка пабудовы навуковага даследавання. Даследаванні нярэдка абапіраюцца на састарэлыя тэарэтычныя асновы. Трэба таксама адзначыць нізкі ўзровень выкарыстання матэматычнага апарату, у асобных даследаваннях дапускаюцца элементарныя памылкі ў прымяненні эканоміка-матэматычных метадаў і мадэляў. Падрыхтоўка па эканамічных спецыяльнасцях у аспірантуры ўстаноў адукацыі, якія не маюць навуковых школ і высокакваліфікаваных навуковых кіраўнікоў, абумоўлівае невысокі ўзровень дысертацыйных работ.

**Дактароў педагагічных навук ва ўзросце 70 гадоў і старэйшым у нас 74% ад агульнай колькасці.**

Віктар Вараб'ёў агучыў шэраг прапаноў па ўдасканаленні сістэмы дзяржаўнай атэстацыі навуковых работнікаў найвышэйшай кваліфікацыі. На сайце ВАК мэтазгодна стварыць рэестр зацверджаных у арганізацыях тэм кандыдацкіх і доктарскіх работ з адкрытым знешнім доступам. Трэба акрэсліваць тэматыку перспектыўных навуковых даследаванняў, якія могуць быць падрыхтаваныя профільнымі міністэрствамі і ведамствамі. Гэта дазволіць выключыць дубліраванне і спрасціць для саіскальнікаў выбар актуальнай для даследавання тэмы.

Можна разгледзець пытанне стварэння ў інтэрнэце адкрытага доступу да тэкстаў дысертацый, якія праходзяць атэстацыю, што ўжо зроблена ў Расійскай Федэрацыі.

Закранулі ўдзельнікі канферэнцыі і патрабаванні да афармлення і аб'ёму кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Сёння і на кандыдацкую, і на доктарскую даецца да 200 старонак (плюс 15 працэнтаў для гуманітарыяў). Раней для кандыдацкай адводзілася да 100 старонак. Многія саіскальнікі ступені кандыдата навук успрынялі гэта як сігнал — трэба пісаць паболей. На практыцы ў многіх кандыдацкіх работах аб'ём да 200 старонак дасягаецца за кошт агульных палажэнняў, выкладання гісторыі пытання, без якога можна абысціся, шматлікага цытавання нарматыўных прававых актаў. Гэта ўсё было і раней, калі дзейнічала абмежаванне ў 100 старонак, а цяпер набыло проста масавы характар. **Але адзін з галоўных крытэрыяў навуковай сталасці — гэта ўменне выкласці свае думкі і аргументы максімальна сцісла.** Таму прагучала прапанова вярнуцца да ранейшага абмежавання для кандыдацкіх дысертацый у 100 старонак.

**У рамках навукова-практычнай канферэнцыі працавалі тры секцыі (секцыя прыродазнаўчых і тэхнічных навук; гуманітарных і сацыяльных навук; медыцынскіх, біялагічных і аграрных навук), а таксама круглы стол, прысвечаны развіццю нарматыўнай прававой базы сістэмы дзяржаўнай атэстацыі навуковых работнікаў. Пра пытанні, якія ўзнімаліся падчас круглага стала, «Звязда» паведаміць у адным з наступных нумароў.**

■ Соцыум

## Як палепшыць даступнасць дашкольнай адукацыі?

**Дзіцячыя сады ў Беларусі змогуць адкрываць платныя групы. Магчымасць рэалізацыі праграмы дашкольнай адукацыі на платнай аснове прадугледжана ў праекце новага Кодэкса аб адукацыі.**

— Дзяржаўныя ўстановы дашкольнай адукацыі змогуць адкрываць платныя групы. Такая патрэба выказвалася бацькамі, адпаведна, да нас паступалі запыты ад дзіцячых садзікаў, — расказала журналістам **намеснік начальніка ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Альбіна ДАВІДОВІЧ.** — Наколькі будуць запатрабаваныя такія групы, пакажа час, але мы такую магчымасць забяспечым. Што датычыцца прагназуемага кошту наведвання платных груп, то прадстаўнік міністэрства адзначыла, што яна будзе залежаць ад набору паслуг, якія рэалізуюцца ў кожнай канкрэтнай групе: «Калі ў адной групе дзеці будуць вывучаць англійскую мову, а ў іншай, акрамя замежнай мовы, будзе яшчэ і харэаграфія, то і аплата, адпаведна, будзе адрознівацца. Можна, вядома, у гэтым выпадку правесці аналогію з прыватнымі дзіцячымі садкамі, але кошт наведвання платных груп у дзяржаўных установах адукацыі будзе істотна ніжэйшы».

Між іншым, па стане на 1 верасня ў нашай краіне дзейнічалі 3817 устаноў дашкольнай адукацыі, з іх толькі 10 прыватных. Як зазначыла Альбіна Давідовіч, апошнім часам вельмі запатрабаваныя бацькамі групы кароткатэрміновага знаходжання (ад 2 да 7 гадзін у дзень) рознай накіраванасці. Яны функцыянуюць у фармаце сезонных гульнявых пляцовак, адаптацыйных груп, мацярынскіх школ, груп вячэрняга знаходжання, выхаднога дня, прагулачных груп. Карыстаюцца попытам таксама групы па падрыхтоўцы дзяцей да школы.

Напрыклад, у дзіцячых садзіках Мінскай вобласці за апошнія тры гады колькасць груп кароткачасовага знаходжання вырасла на 120.

— Гэта звязана з тым, што ў Мінскім раёне існуе праблема забяспечанасці месцамі. Таму мы стараемся максімальна, дзе гэта магчыма, арганізаваць групы кароткачасовага знаходжання на базе ўстаноў адукацыі, — паведаміла **галоўны спецыяліст аддзела дашкольнай, агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ўпраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Ірына МАШКЕТАВА.** — На цяперашні момант у вобласці функцыянуе 709 груп кароткачасовага знаходжання: гэта і адаптацыйныя групы, і мацярынскія школы. Іх наведвае больш за 5 тысяч дзяцей, з іх 3,5 тысячы раней не наведвалі дзіцячы сад.

У Мінску дзейнічае 451 група кароткатэрміновага знаходжання і шэсць сямейных груп. Для сталіцы гэта адносна новая форма ў адрозненне ад сельскай мясцовасці. Сямейныя групы адкрыты ў Фрунзенскім, Маскоўскім і Цэнтральным раёнах — там, дзе пражываюць шматдзетныя сем'і, дзе ёсць сацыяльнае жыллё і вядзецца актыўнае будаўніцтва.

— У нас пакуль не выконваецца нарматыў забяспечанасці месцамі ў Мінскім раёне, у Брэсце і ў Фрунзенскім раёне сталіцы. Аднак сітуацыя паступова паляпшаецца. У бягучым годзе ў краіне былі ўведзены ў строй 11 устаноў дашкольнай адукацыі, яшчэ пяць будуць узведзены да канца года. Летась былі пабудаваныя 12 дашкольных устаноў. Мы перакананыя, што да 2020 года, як гэта было даручана кіраўніком дзяржавы на прашоўшым Рэспубліканскім педсавеце, праблема будзе вырашана, — дадала Альбіна Давідовіч.

Што датычыцца ўдасканалення якасці дашкольнай адукацыі, то прадстаўнік Міністэрства адзначыла, што ў найбліжэйшы час будзе скарэктаваны і абноўлены змест вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі: «Мяркую, што да пачатку 2019/2020 навучальнага года ў нас будзе новая праграма дашкольнай адукацыі, адкарэктаваная з улікам прынцыпаў пераемнасці з першай ступенню агульнай сярэдняй адукацыі. Таксама мы абновім і вучэбныя выданні ў адпаведнасці са зместам новай праграмы». ■

Матэрыялы падрыхтавала
Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*



# БЕЗ ДАЖДЖУ НЕ БУДЗЕ ВЯСЁЛКІ

Дажджлівым вечарам мы з мужам завіталі да сябра на гарбатку. Менавіта там і даведаліся пра «Ірму». На той момант гэты ўраган, які руйнаваў усё на сваім шляху, яшчэ толькі набліжаўся да Фларыды. Глеб быў у роспачы. А ўсё з-за сястры, якая ўжо даўно жыве ў гэтым штаце Амерыкі. «Вось толькі што размаўляў з ёй. Кажа, што днямі прыходзіла паліцыя, рэкамендавалі экстранна збіраць рэчы. Дык вось зараз сястра якраз едзе да сяброў у Алабаму».

Нам, дзякуй богу, не пагражаюць такія страшэнныя ўраганы, бо няма акіяна. Але разам з тым дождж практычна не спыняецца апошнія чатыры месяцы. Бацькі скардзяцца: «Усё затапіла. У агарод не ўлезці. Палова бульбы гнілой. Не памятаем, каб было столькі ападкаў запар. Калі ж той дождж ужо скончыцца!» Заўважыла, што і гараджане ў такое надвор'е ходзяць па вуліцы больш пахмурныя, чым заўжды.

А я вось адносна нядаўна палюбіла дождж. Успрымаю яго (ды і іншыя сюрпрызы прыроды) як знак. Што мы, людзі, робім штосьці не так. Што трэба задумацца, пераасэнсаваць, стаць дабрэйшымі.

А яшчэ ў непагадзь мяне грэе думка: без дажджу не будзе вясёлкі. Яна прыйшла мне ў галаву пасля таго, як аднойчы ўлетку трапіла пад залеву. У той дзень прамокла да ніткі. Памятаю, у роспачы зірнула на неба, — а там вясёлка, ды не адна. Ажно дзве.

Хтосьці са скептыкаў скажа: «То ж улетку. Увосень вясёлкі не бывае». Бывае, ды яшчэ якая! Бачыла яе на ўласныя вочы.

Днямі пайшла абедаць на плошчу Якуба Коласа. У падземным пераходзе каля ЦУМа сустрэла жанчыну, у якой некалькі гадоў таму купіла неймаверна ўтульную вязаную хустку. Побач з ёй прадавала вясёлкавыя букецікі стаціцы сівенькая бабулька з кіёчкам. Яна прапанавала мне восеньскія кветкі. «Дзякуй, — адмовілася я. — Мяне дома падобны цуд ужо радуе».

Неўзабаве вярталася праз той пераход на працу. Але бабулькі з сухацветамі ўжо не было. «Няўжо так хутка прадала», — здзівілася я. «Можна сказаць і так, — усміхнулася жанчына з хусткамі. — Уяўляеце, нейкі хлопец пашкадаваў яе і купіў усе кветкі».

Калі выйшла з перахода, убачыла юнака ў вясёлкавай вязанай кручком шапцы. У яго руках была ахапка сухацветаў. Ён стаяў на праспекце пад дажджом і проста так раздаваў пахмурным мінакам гэтую прыгажосць. Працягнуў і мне.

Іду, усмешка на ўвесь твар, у адной руцэ трымаю парасон, у другой — кветкі. Раптам маю ўвагу прыцягнуў злосны крык. Гэта маладая маці сварылася на свайго маленькага сына (ды так, што давяла таго да слёз). Толькі за тое, што хлопчык вырашыў памераць самую вялікую лужыну. Я хуценька падбегла да жанчыны і працягнула ёй свой букецік.

Праз хвіліну зацяжны дождж скончыўся. Калі я азірнулася, убачыла... вясёлку. Яе трымала ў руках маладая маці і ўсміхалася мне ўслед.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

Сямейная газета
Выпуск №18 (85)

■ Тыя, хто побач

# «Не выбірай жонку ў агародзе, а шукай у карагодзе»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сяргей ВЫСКВАРКА разам са сваёй дачушкай Арынай.

**Фальклярыст і этнахарэограф Сяргей ВЫСКВАРКА ведае, што кажа. Сам выбраў жонку падчас полькі. «Быў неяк тамадой на вяселлі, Валіна сяброўка выходзіла замуж. Колькі сябе памятаю, вельмі любіў танцаваць. Як зайграюць польку, дык аж душа трымціць, так хочацца кінуцца ў скокі. Дык вось, на тым вяселлі адна прыгажуня запрасіла мяне на танец. Але скакала яна цяжка, як ступа. Так у вёсцы казалі, пра дзяўчыну, якая не ўмее ў танцы падладзіцца, падпарадкавацца. Праз нейкі час гарманіст зноў зайграў польку, гляджу — тая прыгажуня ідзе ў мой бок. Танцаваць мне з ёй ужо не хацелася. Я адвярнуўся і схапіў першую, якая побач стаяла. Гэта была Валя. Яна танцавала вельмі лёгенька. Вось так і «станцаваліся» на ўсё жыццё». Гэта было 15 лютага, а праз год — 14 лютага — у іх ужо нарадзіўся Арцём. Яшчэ праз 7 гадоў — Арынка.**

## «Не веру, калі кажуць «каханы», але веру, калі кажуць «родны»

***— Спадар Сяргей, у танцы вядучая роля за мужчынам. А ў сям'і?***

— Сапраўды, у танцы жанчына мусіць даверыцца партнёру, пайсці за ім. У сям'і ўсё наадварот. Нездарма ж кажуць: муж галава, а жонка шыя. Куды шыя паверне, туды галава і круціцца. У нашай сям'і, я магу шчыра сказаць, кіруе Валя. Але робіць гэта правільна. Я, вядома, магу сказаць: «Мы падумалі і вырашылі». Але ж усё адно я згодны з яе рашэннем *(смяецца)*. Мудрая жонка натхняе мужчыну, тым і накіроўвае.

***— Я, дарэчы, пазнаёмілася з мужам у купальскім карагодзе. Падаецца, што гэта адно з найлепшых месцаў для пошуку свайго суджанага.***

— З кім зручна танцаваць, з тым будзе зручна жыць. Гэта дакладна. Нездарма ж некалі пару на ўсё жыццё выбіралі менавіта на вечарынцы. Казалі: «Не выбірай жонку ў агародзе, а шукай у карагодзе» (гэта ўжо потым перайначылі), «навучыся танцаваць, а гора гараваць жыццё навучыць».

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

■ Быць разам

# ГУЛЯЦЬ ДЫК ГУЛЯЦЬ,

## або Настолкі для ўсёй сям'і

**Часта атрымліваецца так, што самыя блізкія людзі ў штодзённых клопатах, мітусні аддаляюцца адно ад аднаго, эмацыйна замыкаюцца і становяцца няздольнымі рухацца далей разам. А кожны, згадзіцеся, марыць пра дружную і шчаслівую сям'ю. На жаль, як стварыць і захаваць яе, рэцэпту няма. Але ёсць шэраг інструментаў, якія даказалі сваю каштоўнасць у стварэнні добрай атмасферы ў доме. Сёння гутарка пойдзе пра адзін з найстарэйшых з іх — настольныя гульні.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*




Фота Надзеі БУЖАН.

■ За дзвярыма кабінета

# «ПСІХОЛАГ НЕ МАЕ ПРАВА АСУДЖАЦЬ»

## Чаму перадабортнае кансультаванне — гэта перш за ўсё клопат пра жанчыну

**У ліпені ў Мінску ў трох паліклініках — 10-й, 23-й і 37-й — былі адкрыты кабінеты «За жыццё», дзе праводзяць перадабортнае кансультаванне. Мяркуецца, што да новага года з'явяцца яшчэ тры, каб паслуга была даступна ва ўсіх раёнах сталіцы. Такія кабінеты павінны спрыяць павышэнню нараджальнасці. Але ў людзей кансультаванне выклікае шмат пытанняў. Хто яго будзе праводзіць?**
**Чаму гэта неабходна для ўсіх? Ці не бярэ на сябе спецыяліст залішнюю адказнасць, прымаючы рашэнне за жанчыну?**
**З гэтымі пытаннямі мы звярнуліся да галоўнага пазаштатнага акушэра-гінеколага па амбулаторнай рабоце Мінска, загадчыцы жаночай кансультацыі 37-й гарадской паліклінікі Аксаны КАРОТКІХ.**



— Адкрыццё кабінетаў «За жыццё» было нашым даўнім планам, — расказвае Аксана Караткіх. — Раней перадабортнае кансультаванне праводзілі валанцёры: цэнтр падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля» дасылаў сваіх спецыялістаў у некаторыя ўстановы. У гэтым годзе мы змаглі дабіцца таго, каб у жаночых кансультацыях выдзеліў стаўкі псіхолагаў. Рыхтаваць патрэбныя нам кадры дапамагае той жа цэнтр «Матуля». Таксама ў Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі арганізаваны курсы па аказанні псіхалагічнай падтрымкі.

**Прыкладна 15 працэнтаў жанчын ідуць на аборт з-за праблем з мужам. Кажуць: «ён не працуе», «не дапамагае», «няўпэўнена ў ім».**

Па законе аб ахове здароўя ніякае перарыванне цяжарнасці цяпер не робяць без перадабортнага кансультавання. Такі падыход ужо даўно дзейнічае ў многіх краінах, у суседняй Расіі ў тым ліку. Мы ў Еўропе аказаліся амаль апошнімі, хто да гэтага прыйшоў.

***— Чаму кансультаванне праводзяць псіхолаг, а не ўрач?***

— Першапачаткова так і было: гутарку ўсклалі на акушэраў-гінеколагаў. Але, вядома, і лічу, гэта няправільна. Асабліва ў камерцыйных структурах, дзе ўрачу больш выгадна зрабіць перарыванне цяжарнасці і атрымаць нейкі працэнт ад сумы, заплачанай за аборт, чым бясплатна кансультаваць.

***— Якія жанчыны прыходзяць у кабінеты «За жыццё»?***

— Вельмі розныя. Адны настроены катэгарычна і не хочуць нічога слухаць. А ёсць тыя, хто прыходзіць сямейнымі парамі і гатовы абмяркоўваць сітуацыю. І потым яны вяртаюцца, дзякуюць псіхолагу за тое, што ён адкрыў ім вочы на нейкія рэчы. Мы нават паспрыялі таму, каб некалькі пар падалі заяву ў ЗАГС *(усміхаецца)*! Задача псіхолага — не адгаварыць перарываць цяжарнасць, а зразумець праблему і дапамагчы прыняць патрэбнае для гэтай сям'і рашэнне. Выбар заўсёды застаецца за жанчынай.

***— Але ж яна, напэўна, і так для сябе ўжо ўсё ўзважыла, калі прыйшла на аборт?***

— Не зусім так. Цяпер, напрыклад, ёсць медыкаментозныя аборты: каб пазбавіцца ад цяжарнасці, дастаткова прыняць дзве таблеткі. Бывае, жанчына спужаецца навіны аб будучым мацярынстве, паспявае выпіць таблетку, а на наступны дзень прыбягае ў слязах: «Я падумала, паразмаўляла з мужам, а можна мне другую не піць?»

Усе формы перарывання цяжарнасці — гэта аборт. І наступствы ніхто ніколі не ведае. У нас ёсць пацыенткі, якія некалі па маладосці зрабілі вакуум, і цяпер ужо пятае ЭКА — і нічога не атрымліваецца. Пасля псіхалагічнага кансультавання даецца тры дні. Такі час цішыні, каб жанчына магла падумаць, абмеркаваць усё з сям'ёй. Тады гэта будзе ўсвядомленае рашэнне.

***— Чаму вырашаюцца на аборт? Толькі фінансавая прычына?***

— Мы ў жніўні праводзілі аналіз. Падлічылі, што прыкладна 15 працэнтаў жанчын ідуць на аборт з-за праблем з мужам. Кажуць: «ён не працуе», «не дапамагае», «няўпэўнена ў ім». Стольkі ж прыкладна называюць прычынай тое, што стаміліся і хочуць адпачыць. Гэта тыя, у каго ўжо ёсць двое-трое ці нават пяцёра дзяцей. Вось такія часцей за ўсё потым адмаўляюцца перарываць цяжарнасць. Яшчэ 15 працэнтаў — па стане здароўя: п'юць лекі, знаходзяцца на антыдэпрэсантах, перанеслі аперацыю. Матэрыяльны фактар аказаўся, як ні дзіўна, толькі на пятым месцы — яго называюць каля сямі працэнтаў. Яшчэ столькі ж не гатовы стаць мамамі, бо не замужам. І зусім маленькі працэнт тых, хто ўвогуле не хоча мець дзяцей.

***— Ці многія змяняюць сваё рашэнне пасля кансультавання?***

— 15—20 працэнтаў. Увогуле, палова жанчын перадумвае рабіць аборт яшчэ на прыёме ў гінеколага і да псіхолага не даходзіць.

***— А якую катэгорыю амаль немагчыма пераканаць?***

— Маладых студэнтак. Дзяўчына ў 18 гадоў баіцца прызнацца сям'і і спрабуе хутчэй пазбавіцца ад непажаданай цяжарнасці. Але як толькі яна ўсё раскажа бацькам, будучае дзіця перастане здавацца такой праблемай, бо, хутчэй за ўсё, яе падтрымаюць.

Ведаеце, да псіхолага адпраўляюць і тых жанчын, якія не хочуць рабіць аборт, а цяжарнасць ім катэгарычна супрацьпаказана па стане здароўя. Не, мы не прымушаем іх не нараджаць. Але псіхолаг рыхтуе жанчыну да таго, што яна мусіць назірацца ва ўрача, бо знаходзіцца ў зоне рызыкі.

***— Складана працаваць з роднымі цяжарных: іх маці, мужамі? Чула меркаванне, што, калі маці жанчыны супраць таго, каб яна нараджала, адгаварыць ад аборту цяжка.***

— Гэта праўда. Памятаю, адна жанчына тройчы прыходзіла да мяне на прыём і казала, што вельмі хоча захаваць цяжарнасць, і муж падтрымаў, але з мамай узнік канфлікт. Яна заяўляла дачцэ: «Расціце дзяцей самі, я вам дапамагаць не буду...» Ведаеце, мама — гэта родны чалавек, і што б яна цяпер ні казала, калі ўбачыць унукаў, зменіць гнеў на міласць. А вось калі муж пагражае пайсці з сям'і, тут складаней вырашыць сітуацыю.

**Задача псіхолага — не адгаварыць перарываць цяжарнасць, а зразумець праблему і дапамагчы прыняць патрэбнае для гэтай сям'і рашэнне.**

***— Ці не будуць жанчыну на кансультаванні асуджаць за яе выбар перарваць цяжарнасць?***

— Я з падобным не сутыкалася. Але калі раптам такі псіхолаг з'явіцца, з ім трэба будзе развітвацца, бо асуджаць ён не мае права, гэта не яго задача. Яго мэта — дапамога.

***— Па вашых назіраннях, наколькі беларускі адукаваныя ў сферы рэпрадуктыўнага здароўя?***

— Нягледзячы на тое што інфармацыі па гэтай тэме ў інтэрнэце мора, часам прыходзяць жанчыны, якія не ведаюць аб формах кантрацэпцыі. Паколькі паліклініка знаходзіцца побач з кальцавой, да нас прыязджаюць і жыхаркі Мінскага раёна, а не толькі сталіцы. Была неяк пацыентка, якая лічыла, што, прабачце, прэзерватыў — рэч шматразовая! Многія ўпэўнены, што калі яны кормяць грудзямі, то зацяжарыць не могуць. Хоць усюды існуюць школы цяжарных, дзе адна з тэм — кантрацэпцыя ў пасляродавым перыядзе. Усё не так добра з інфармаванасцю ў XXI стагоддзі, як здаецца.

На маю думку, адукацыя павінна ісці са школы. Мы, напрыклад, ходзім на лекцыі ў мінскія навучальныя ўстановы: збіраем вучняў 9-х і 10-х класаў і расказваем пра здаровы лад жыцця, планаванне сям'і. Гэта важна для таго, каб зменшыць колькасць абортаў у будучыні.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

**Даведка «Звязды»**

У 2016 годзе ў Беларусі было зарэгістравана амаль 27,5 тысячы абортаў. Гэта на 1,7 тысячы менш, чым у 2015-м. Львіную долю даюць камерцыйныя цэнтры. У Мінску, напрыклад, у платных установах робіцца абортаў больш, чым ва ўсіх паліклініках горада.

Абортам заканчваецца кожная пятая цяжарнасць. Па статыстыцы жаночых кансультацый сталіцы, для 20 працэнтаў гараджанак, якія вырашаюцца пазбавіцца ад дзіцяці, гэта цяжарнасць першая.

■ Бацькі і дзеці

# ДРУГАЯ МАМА,

## або Запаветы сапраўдных свякрухі і цешчы



**Пра свякруху ды цешчу складзена вельмі шмат анекдотаў. Але, вядома, далёка не ўсе свaячкі такія ўжо дрэнныя, як пра іх жартуюць. І вы таксама, напэўна, не хочаце быць падобнай на гераіню якога-небудзь анекдота. А як стаць добрай свякроўю ці цешчай?**

Перш чым штосьці раіць, прапаноўваю вам успомніць сваю ўласную свякроў. Прааналізаваўшы адносіны з ёй, вы зможаце вынесці нейкія ўрокі для сябе. Ці ўсё было так, як вам таго хацелася? Паспрабуйце паставіць сябе на месца вашай нявесткі (зяця) — як жа ёй (яму) зараз з вамі? Як думаеце, ці не паўтараеце вы якіх-небудзь памылак сваёй свекрыві? Будуючы адносіны з новым членам сям'і, варта памятаць пра «залатое правіла маральнасці»: «Дзейнічайце ў адносінах да іншых так, як вы хацелі б, каб іншыя дзейнічалі ў адносінах да вас». А таксама...

1. Не чакайце імгненнай любові. Для таго каб у адносінах з'явілася цеплыня, неабходны час.

2. Не настойвайце, каб нявестка (зяць) адразу стала (-ў) называць вас «мамай». Магчыма, яна (ён) будзе адчуваць сябе больш камфортна, называючы вас па імені або па імені ды па імені па бацьку. Паспрабуйце разам прыняць рашэнне аб гэтым, не ствараючы асаблівай праблемы.

3. Не стаўцеся да вашай нявесткі (зяця) як да саперніцы(-ка). Добразычліва прымійце папаўненне ў вашу сям'ю. Прымножце любоў, а не падзяляйце яе.

4. Не чакайце, што маладыя стануць жыць па вашых стандартах. Яны ўтварылі новую сям'ю і павінны выпрацаваць свае ўласныя сямейныя каштоўнасці і традыцыі.

5. Не настойвайце, каб ваш сын (дачка) удзяляў (-ла) вам увагі гэтак жа шмат, як да жаніцьбы. Зараз у яго (яе) ёсць свая сям'я, якая павінна быць на першым плане.

6. Ніколі не давайце няпрошаную параду. Райце толькі ў тым выпадку, калі вас аб гэтым папрасілі.

7. Ніколі нікому не жальцеся на сваю нявестку (зяця).

8. Стаўцеся да нявесткі (зяця) як да роднай дачкі (сына). Адчуваючы вашы цяпло і добразычлівасць, яна (ён) будзе ставіцца да вас як да другой мамы.

9. Змагайцеся з жаданнем вырашаць за маладых праблемы, з якімі яны могуць сутыкнуцца. Вось тут можа спатрэбіцца ваша парада. Прапануйце выйсце з сітуацыі, якая склалася, падкажыце, як дзейнічаць. Калі вы будзеце дзейнічаць самі, тым самым станеце заахвочваць залежнасць маладых ад вас.

10. Жывіце сваім паўнавартасным жыццём. Маладыя самі будуць будаваць сваю сям'ю, набываючы ўласны вопыт. Бачачы, што ваша жыццё напоўнена рознымі справамі і падзеямі, дзеці самі будуць імкнуцца да зносін з вамі. А вы зможаце радавацца жыццю, не звужаючы кола сваіх інтарэсаў да праблем маладой сям'і.

Падрыхтавала
**Наталля МАЎЧАНАВА**

■ Здарова жыць здорава!

# ДЛЯ ТАГО КАБ ХУДЗЕЦЬ — ТРЭБА ЕСЦІ

## Галоўныя памылкі ў нашым харчаванні

**У пагоні за прыгажосцю многія марнуюць свой арганізм неправеранымі дыетамі нават не падазраваючы, што аснова здароўя і добрага самаадчування — правільнае харчаванне. Для таго каб арганізм атрымліваў неабходную колькасць пажыўных рэчываў і засвойваў іх, неабходна прытрымлівацца пэўных правілаў. Якія прадукты дапамогуць разнастаіць рацыён харчавання, расказала ўрач-дыетолаг, намеснік галоўнага ўрача медыцынскага цэнтра зніжэння вагі Марта МАРУДАВА.**

***— Як з дапамогай рацыёну падтрымаць фізічнае і псіхалагічнае здароўе?***

— Сапраўды, вага — гэта не толькі наш фізічны стан, але і псіхічны, і псіхалагічны ў тым ліку. Цяпер, восенню, вельмі важна есці тыя прадукты, якія хоць крыху адрозніваюцца ад зімовага і летняга рацыёну. Варта аддаваць перавагу цёплай ежы. Бо калі становіцца холадна, хочацца цяпла, сонца, святла, таму з дапамогай прадуктаў, напрыклад рагу або какавы, можна падняць сабе настрой і прыём ежы зрабіць смачным, правільным і карысным. Пры гэтым не варта забываць, што восенню ёсць і праблема сезоннай садавіны. Напрыклад, цяпер шмат кавуноў, дынь і іншых прысмакаў, якія чалавек ужывае бескантрольна, але важна не забываць, што ў іх шмат цукру, таму ў рацыёне яны павінны быць у невялікай колькасці.

***— Якія прадукты варта абавязкова ўключыць у сваё меню восенню, каб быць стройнай і прыгожай?***

— Уключаць у свой рацыён трэба ўсю сезонную садавіну. Яна карысная для любога чалавека, бо важна папаўняць свой арганізм вітамінамі. Але ўжываць бескантрольна іх усё ж нельга. Калі мы ядзім кавуны — гэта не палова кавуна адразу. Любую садавіну мы ўжываем паштучна: адзін-два бананы, два персікі. Гэта тое, што павінна быць строга лімітавана.

***— Можаце агучыць асноўныя правілы здаровага харчавання?***

— Іх усяго некалькі. Першае — гэта дробнае харчаванне. Максімальны прамежак паміж прыёмамі ежы не павінен перавышаць 3,5—4 гадзіны. Фактычна рацыён чалавека павінен складацца з трох вялікіх прыёмаў ежы: сняданак, абед, вячэра і два перакусы ў залежнасці ад таго, у колькі гадзін чалавек кладзецца спаць. Другое правіла — рухомы лад жыцця. Бо калі чалавек харчуецца правільна, але пры гэтым суткамі ляжыць на канапе, ні пра якую стройнасць гаворкі быць не можа.

***— Калі не хапае часу паўнавартасна паабедаць, што можна ў такім выпадку з'есці, каб добра сябе адчуваць?***

— Калі не хапае часу на паўнавартасны абед, то з сабой адназначна трэба нешта браць. Гэта могуць быць агародніна, арэхі, нейкі фрукт, галоўнае, — ежа заўсёды павінна быць пад рукой. Бо голад мае ўласцівасць назапашвацца. І тады чалавек ўвечары будзе пераядаць, што паўплывае на самаадчуванне.

***— За колькі гадзін да сну можна нешта з'есці?***

— За паўтары-дзве гадзіны. Наогул, ёсць пэўныя стандарты для чалавека, які зніжае вагу. Напрыклад, 350 ккал павінна складаць вячэра дзяўчыны ці жанчыны. Калі гэта мужчына, то не больш за 450 ккал, для таго каб з цяжкім жыватом не ўкладвацца спаць і назаўтра раніцай не прачынацца з нейкімі праблемамі.



***— Усё-такі, калі хочацца скінуць пару лішніх кілаграмаў, якую дыету лепш выбраць?***

— Напэўна, шмат хто будзе здзіўлены, але лішняя вага не лечыцца дыетамі. Ёсць шэраг дыягназаў, калі да лекара прыходзіць чалавек і кажа, што хацеў бы вылечыць язвавы каліт або атапічны дэрматыт. У такім выпадку прызначаецца канкрэтная дыета: прыбіраецца канкрэтны прадукт альбо падбіраецца набор прадуктаў, з дапамогай якіх можна вылечыцца ад пэўнага захворвання. Калі мы гаворым пра стройнасць і зніжэнне вагі, то, як ні парадаксальна, — трэба лечыцца ежай. Для таго каб худзець, трэба есці. І стройнасць — усё ж такі не дыета, а рухомы лад жыцця.

***— А што трэба разумець пад актыўным ладам жыцця?***

— 10 тысяч крокаў — тая норма, якую чалавек павінен прайсці за дзень. Гэта дзесьці каля гадзіны хадзьбы, што складае 5—6 кіламетраў. Але хадзіць трэба штодня, без усялякіх паблажак. Актыўны лад жыцця — гэта яшчэ і знаходзіцца на свежым паветры, гэта не гульні за камп'ютарам, а гульні на вуліцы: футбол, рызыначкі, класікі. Бацькам трэба максімальна займаць дзяцей, знаходзячыся з імі па-за домам.

***— Цяпер модна сядзець на розных дыетах. Напрыклад, на працягу тыдня ўжываць толькі агародніну і садавіну. Мэта такой дыеты — скінуць пару лішніх кілаграмаў звычайна дасягаецца. Але як гэта ўплывае на здароўе?***

— Добра, калі ў вас няма ніякіх захворванняў. Калі вы пасядзіце на такой дыеце, самаадчуванне не пагоршыцца. Але калі чалавек з лішняй вагой мае шэраг хранічных захворванняў, то гэта небяспечна, паколькі можна выклікаць абвастрэнне ўжо існуючых дыягназаў. Таму, калі вы хочаце нейк перагледзець сваё харчаванне, лепш звярнуцца па кансультацыю да доктара.

***— А мужчынам таксама важна сачыць за сваёй вагой?***

— Так. Першая прыкмета здаровага мужчыны — гэта аб'ём таліі. Калі ён перавышае 94—96 сантыметраў, варта ўжо падумаць, што ў рацыёне нешта не так. Таксама як і дама, ведаючы, што аб'ём яе таліі большы за 84 сантыметры, павінна перагледзець сваё харчаванне і лад жыцця.

***— Бывае такое, што здаецца, быццам нічога не ясі, але вага набіраецца. Што рабіць у такім выпадку?***

— Першае, з чаго я рэкамендую пачаць і што безумоўна працуе, — гэта вядзенне харчовага дзённіка. Калі чалавек скрупулёзна запісвае ўсё тое, што ён з'еў і выпіў на працягу дня, тады многае становіцца зразумелым і без спецыяліста.

***— Колькі кілаграмаў у месяц можна скінуць без шкоды для арганізма?***

— Калі мы гаворым пра самастойнае скідванне вагі, без медыцынскай дапамогі, то гэта не больш за 3—4 кілаграмы ў месяц. Калі гаворка ідзе пра іншыя лічбы, то без кансультацыі спецыяліста тут не абысціся. Калі мэта — утрыманне вагі, у якой вы зараз знаходзіцеся, тады павінен быць бялок у рацыёне, складаныя вугляводы і мінімум тлушчаў. Калі мы працуем на тое, каб скінуць вагу, то тут трэба будзе скрупулёзна хоць бы першы час падлічваць бялкі, тлушчы і вугляводы, каб разумець, адкуль бяруцца гэтыя самыя лішнія кілаграмы.

Каб быць у форме, трэба правільна харчавацца і пастаянна рухацца — не некалькі тыдняў, а на працягу ўсяго жыцця. Есці ж можна і трэба смачна, разнастайна, карысна, пры гэтым імкнуцца атрымаць як мага больш станоўчых эмоцый.

**Карына ВАКУЛІЧ**

■ Фотаздымак з гісторыяй

# ШТО САМАЕ ПРЫГОЖАЕ?



Аднакласніца даслала мне з Мінска фотаздымкі нашага далёкага юнацтва. Тым картачкам больш за 40 гадоў. І я, з яе дазволу, вырашыў падзяліцца адным фота з чытачамі любімай газеты. Гляджу на яго і разумею, што беларускія дзяўчаты самыя прыгожыя ў свеце!.. Здымак зроблены дзесьці ў 1972—1973 гадах у вёсцы Камуна Любанскага раёна. На ім — тры сяброўкі, мае аднакласніцы *(злева направа)* Галіна Мазур, Валянціна Кульбіцкая ды Ала Піскун. Апошняя на той час ужо была замужам. На здымку яна пяшчотна прыціскае да грудзей сваю аднагадовую дачушку Іначку.

Прайшло шмат гадоў, але мы не згубіліся, працягваем падтрымліваць стасункі, нягледзячы на адлегласць. Ала цяпер жыве ў Гродне, Валя — у Мінску, Галя засталася ў роднай вёсцы, я — у Вялікай Бераставіцы. Апошнім часам часта тэлефануем адно аднаму. Успамінаем школьныя гады, юнацтва, дзелімся надзённымі навінамі, поспехамі дзяцей і ўнукаў.

**Міхаіл МАСКАЛЬЧУК.**

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома. Здымкі (не больш за тры) з гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца***

■ Карысныя парады

# Рыхтуем склеп да зімоўкі

**Захаванасць агародніны шмат у чым залежыць ад таго, як падрыхтаваны наш склеп да закладкі новага ўраджаю. Перш за ўсё, сховішча трэба вычысціць, добра выветрыць і прадэзынфікаваць. Як лепш за ўсё гэта зрабіць?**

Пачнём з драўляных паліц, стэлажоў і засек. Іх трэба разабраць і вынесці на двор, прамыць гарачай вадой з содай, а затым прасушыць на сонцы! Дэзынфекцыю драўляных дэталяў і сцен супраць грыбных хвароб мы з жонкай робім наступным чынам: двойчы белім вапнай, дадаючы медны купарвас (100 г на вядро вапнавага раствору). А вось каб пазбавіць сховішча ад гнілі ды цвілі, сцены і драўляныя канструкцыі прамываем, а затым паліваем з палівачкі драўляную падлогу склепа 10-працэнтным водным растворам меднага купарвасу (100 г на 1 літр вады). Супраць розных насякомых і гнілasных грыбоў праводзім дэзынфекцыю парамі, якія ўтвараюцца пры гашэнні вапны. На кожныя 10 кубаметраў аб'ёму сховішча бяром 3 кг нягашанай вапны, засыпаем у бочку і заліваем вадой. Праз тыдзень гэтую працэдуру трэба па магчымасці паўтарыць!

Каб склеп у працэсе эксплуатацыі заўсёды заставаўся сухім, не адсырэў, яго старанна трэба ўцяпліць і забяспечыць дастатковай вентыляцыяй!

### Папараць дапаможа захаваць моркву

Многія дачнікі ведаюць, што не проста захаваць ураджай морквы нават у падрыхтаваным склепе! Але ёсць адзін маленькі сакрэт. Раю пасля ўборкі з агарода і лёгкай яе прасушкі пакласці моркву разам з лісцем папараці ў вялікія цэлафанавыя пакеты і апусціць у склеп. У такім выглядзе гэтая агародніна здольная праляжаць да самай вясны, не страціўшы пры гэтым сваіх смакавых і гаючых якасцяў!

Толькі вось завязваць пакеты з морквай нельга, паколькі паветра павінна свабодна цыркуляваць унутры.

### Як атрымаць добры ўраджай бульбы?

А цяпер я падзялюся сваім вопытам, як можна атрымаць добры ўраджай бульбы з насення сёлетняга ўраджаю са свайго ўчастка. Не спяшайцеся прыбіраць у склеп толькі што выкапаныя клубні. Пакіньце іх на некаторы час каля лункі. Гэта дазволіць вам наглядна вызначыць, якія кусты бульбы акажуцца больш удалымі ў наступным годзе. Ведайце, што лепш спыніць свой выбар на тых клубнях, дзе на градцы было шмат роўных бульбін. Вось з іх адразу пасля таго, як выкапалі, і трэба адбіраць свой насенны фонд. Не апраўдаюць вашы чаканні тыя кусты, дзе было ўсяго па 1—2 буйныя бульбіны, а астатнія дробныя. Паверце, такі спосаб адбору насеннага матэрыялу проста з градкі вельмі эфектыўны, і мы гэта адчуваем кожны ўраджайны год пры ўборцы бульбы ў верасні.

### Пластыр для гарбуза

Тыя гарбузы, у якіх выпадкова адарваліся пладаножкі, а таксама плады з іншымі пашкоджаннямі адкладзём убок. Па магчымасці іх мы выкарыстоўваем у ежу ў першую чаргу. А вось неглыбокія драпіны на лупіне (такія траўмы хутка загніваюць) можна замазаць зялёнкай або заляпіць бактэрыцыдным пластырам! Пасля такой немудрагелістай працэдуры нашы гарбузы будуць захоўвацца працяглы тэрмін.

**Яўген САЛАНОВІЧ,**
**дачнік са шматгадовым стажам**

# «Не выбірай жонку ў агародзе...»

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Вы са сваёй жонкай разам ужо 20 гадоў. Што самае галоўнае ў сям'і?***

— Цяпер у аснову адносінаў ставяць каханне. А яшчэ вышэй секс. Не згодны. Калі няма «дроў» з павагі і ўзаемаразумення, то каханне хутка згасне. Асабліва калі ўзнікнуць першыя цяжкасці ў жыцці. Як адна з маіх калег казала: «Я не веру, калі кажуць «каханы», але веру, калі кажуць «родны». Калі чалавек, які па крыві не радня, стаў родным, вось гэта ўжо сапраўды трывалая сям'я.

**«Маці галасіла, а бацька падышоў і проста паціснуў руку. Я бачыў слёзы ў яго ў вачах. Але не звонку, а там, за зрэнкамі».**

***— Вы вучыце беларускім народным танцам ва ўсіх куточках краіны і нават за яе межамі. Ды і ўсе фальклорныя фестывалі прыходзяцца звычайна на выхадныя. Як вырашаеце пытанне з сям'ёй, родныя не крыўдуюць, што вас часта не бывае дома?***

— Тут трэба сказаць дзякуй жонцы. Калі я стварыў дарослы ансамбль «Напарачка», Валя мая гады два танцавала ў ім. А потым сама вырашыла, што тыл павінен быць дома. Мне пашанцавала. Гэта такі надзейны тыл, які ў любы момант і падтрымае, і дапаможа, і збярэ, і перакане. Гэта ўсё наша мама *(пазірае на дачушку, якая падчас інтэрв'ю тулілася да таткі)*. Яна ў нас кіроўца. На машыне куды трэба завязе, адкуль трэба забярэ.

## «Мяне ў Доме культуры называюць «бабнікам»

***— Вы запісалі больш як 100 танцаў, якія былі папулярныя на Любаншчыне. Атрымліваецца, ведаеце ўсіх бабулек у раёне?***

— Шчыра скажу, ёсць яшчэ некалькі вёсак, у якіх я нават ні разу не быў з экспедыцыяй. Але збіраюся. Многіх носьбітаў ужо, на жаль, няма ў жывых. Мне пашчасціла паспець пазнаёміцца з імі. Мяне тут, у Доме культуры, празвалі «бабнікам». У сэнсе, спецыялістам па бабульках. Пазвоніць хтосьці: «Дзе Выскварка?» — «Па бабах паехаў», — адказваюць.

***— Бабулькі ж усе розныя. Як знаходзіце падыход?***

— Сапраўды розныя, але ўсе любяць павагу і ўвагу. А я іх люблю як носьбітаў. Многіх і ўспрымаю як сваіх родных бабуль. У Ямінску жыве Зінаіда Іванаўна Раманчук, ёй сёлета споўнілася 80 гадоў. Мы ездзілі яе віншаваць з юбілеем. Дык яна мяне абдымала і казала: «Сярожка, я ж да цябе як да роднага сына адношуся».

Цяпер лягчэй знаходзіць падыход, бо мяне ўсе ведаюць. А напачатку... Вельмі цяжка было збіраць фальклор у родным сяле. Бо калі прыходзіў, напрыклад, да бабы Надзі, дык яна пыталася пра маму, пра братоў і сясцёр. І гэта размова магла зацягнуцца надоўга.

Ніколі не забудуся, як прыехаў у вёску Кузьмічы да Ганны Рыгораўны Палазнік. Аўтобус хадзіў туды ў 90-я гады адзін раз на дзень.Таму мне нічога не заставалася, як застацца на ноч. Памятаю, сядзім за сталом, спяваем з бабай Ганнай. А яна старэнькая, голас хрыпіць. Кажа мужу: «Васіль, там за газам стаіць». Ён прынёс бутэльку віна. Я ж маладзенькі тады быў, кажу: «Я не п'ю». А яна: «А я не спяваю» *(смяецца)*. І вось мы да раніцы пілі віно і спявалі.

Часта ўспамінаю Таццяну Якаўлеўну Кішылаву з вёскі Юшкавічы. Мой Арцём яе вельмі любіў, як быў маленькі, мы часта да яе ездзілі, як да роднай бабулі. Яна мне раскажа крыху пра вяселле і яшчэ нешта. А я: «А яшчэ?» — «Не, а гэта на наступны раз» *(смяецца)*. Ёй увагі трэба было часцейшай, хацела, каб я прыехаў зноў. Пра кожную з бабуль (і дзядуль, дзякуй богу) магу гаварыць бясконца. Калі танец успамінаю, то за ім абавязкова нехта стаіць, чалавек або гурт, ды гісторыя, калі ён знайшоўся.

**«Цяпер у аснову адносінаў ставяць каханне. А яшчэ вышэй секс. Не згодны. Калі няма «дроў» з павагі і ўзаемаразумення, то каханне хутка згасне».**

***— Які танец дастаўся цяжэй за ўсё?***

— «Танец каваля». Ніхто не ведаў, як яго танцаваць. Я запісаў яго ў вёсцы Старыя Юркавічы ад Аўдоцці Сцяпанаўны Чэкан. Ёй на той момант было ажно 102 гады. Памятаю: зайшоў у хату, бабуля ляжыць у ложку. «Дзіцятка, ты заходзь, я буду драмаць, а ты размаўляй». Яна мне гэты танец на пальцах паказвала. А я перад ёй па хаце танцаваў. Аўдоцця Сцяпанаўна ж казала: так ці не. Калі б хто тады запісаў той майстар-клас на відэа — гэта было б смехаўё. Толькі ўявіце, вясковая хата, нефарбаваная драўляная падлога, я і бабуля ў ложку... Аўдоцця Сцяпанаўна вельмі любіла танцаваць, казала: «Полькі ды мазуркі ногі адабралі».



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У аграгарадку Рачэнь побач з Надзеяй ВЕРАМЕЙЧЫК з фальклорнага гурта «Шчодрык».

**Народны гумар ад Сяргея Выскваркі (ён узначальвае яшчэ і народны гурт «Смехаўё»).**

- *Дзяды правялі вачыма прыгожую маладзіцу і ў адзін голас кажуць: «Божа, забраў сілу — забірай і вочы».*
- *Як толькі заяц на парог, дык цешча за яйкі.*
- *Адна суседка крычыць другой праз плот: «Мар'я-а, кажуць, ты з маім Іванам спала!». А тая рагоча: «Хіба ж з тваім Іванам заснеш?».*




Арынка — незаменны татаў памочнік падчас майстар-класаў па танцах. На здымку яны танцуюць польку «Каза».

## «Надзела народны строй, калі ёй было тры годзікі»

***— Арына, ведаю, што ты змалку танцуеш з «Верабейкамі» (дзіцячы ўзорны фальклорны танцавальны ансамбль, якім ужо амаль 25 гадоў кіруе Сяргей Выскварка). Тата прымусіў ці сама захацела?***

— *(Арына паціскае плячыма)* Я не памятаю, прымушалі мяне ці не.

— І Арцём, і Арына трапілі ў ансамбль натуральна. Як у вёсцы некалі: дзе бацькі, там і дзеці. Упершыню Арынка надзела народны строй, калі ёй было тры годзікі. Мы з «Верабейкамі» прадстаўлялі нашы танцы ў летніку, дзе адпачывалі дзеці з Расіі. А мне не было куды дачушку дзець. У нас у ансамблі не знайшлося строю такога маленькага памеру, таму давялося падкладаць кашулю. Дарэчы, на Арынцы тады быў андарак нашага роду. Баба Аксіння свой стары парвала на анучы. Адзін яго кавалак застаўся, дык я пашыў такі маленькі андарачок для дачушкі.

***— Ці перадалася Арыне ваша любоў да народных танцаў?***

— Як толькі якая дзяўчынка хораша танцуе, усе пытаюцца: «Гэта ваша дачка?».

***— І што адказваеце?***

— Кажу, што мая *(смяецца)*. Усе мае. У маім ансамблі займаюцца вельмі шмат братоў і сясцёр. Раней увесь Арцёмаў клас танцаваў у мяне, цяпер і Арынчын. Такога інтарэсу, каб аж падалі за гэтым, зараз ні ў сына, ні ў дачкі няма. Узрост такі, пераходны. Хоць яшчэ да пазамінулага года Арына мяне «мучыла» дома, яна ўсе танцы старалася ведаць раней за дзяцей. Што рабіць, танцавалі пад язык. У нас з дачушкай нават ёсць фірменны танец, які толькі мы з ёй танцуем, — называецца «Абэрак».

***— Вы строгі тата?***

— Я для сябе аднойчы вырашыў, што не буду караць дзяцей, сварыцца на іх. Хоць свайго тату памятаю строгім. Ніколі не забудуся той дзень, калі мяне забіралі ў войска. Маці галасіла, а бацька падышоў і проста пацінуў руку. Я бачыў слёзы ў яго ў вачах. Але не звонку, а там, за зрэнкамі. Ведаю, што ён мяне вельмі любіў. Але ж так хацелася, каб пагладзіў па галаве, прытуліў. Я, напрыклад, не саромеюся абняць сына, хоць яму ўжо 19 гадоў. Не кажучы ўжо пра вось гэтую тулялку *(мацней прыціскае да сябе Арынку)*.

***— Што выберыце: паехаць у іншы горад, каб правесці майстар-клас, ці пагуляць з Арынай у шашкі?***

— А я вазьму з сабой і Арыну, і шашкі *(смяецца)*. Першы раз зімой у Польшчу паехаў адзін, без дачкі, бо ў яе не выйшла са школай. Мне было даволі складана. Другі раз, ужо летам, мы ездзілі разам з Арынай. Гэта ж мой незаменны памочнік, яна фактычна магла малодшай групай кіраваць, як настаўніца. Абавязкова бяру з сабой дачку, калі ёсць магчымасць. У кастрычніку разам паедзем паказваць беларускія танцы ў Вільнюс. Так што будзем па дарозе ў шашкі гуляць.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

*г. Любань*

## БЛІЦ-АПЫТАНКА

***— Месца сілы і натхнення?***

— Дзедава хата ў вёсцы Пласток. Калі я зусім стамляюся, мне проста хочацца туды хоць на гадзінку.

***— Калі б вам прапанавалі за дзедаву хату вялікія грошы, прадалі б?***

— Нізашто! Гэта як радзіму прадаць.

***— Калі б на вас звалілася некалькі тысяч долараў, на што б вы іх патрацілі?***

— На хусткі з узорамі! — апярэджвае тату Арына. — Такія чырвоныя...

— Бачыце, што дзіця гаворыць *(смяецца)*. Вось гэта *(паказвае)* амерыканскі аналаг даўніх баранаўскіх хустак. Была такая фабрыка Асафа Баранава ў XIX стагоддзі. Гэтыя хусткі лічыліся вельмі моднымі ў вясковым асяроддзі... Сёння я грошы патраціў бы на свой Пласток. У мяне ёсць даўняя мара. У нас у вёсцы царквы ніколі не было, але шмат веруючых людзей. Хачу адну з закінутых хатак, што побач з дзедавай, прыстасаваць пад дом малітвы. Цудоўна было б сабраць там усе іконы Божай Маці, якія ёсць у свеце. Другую закінутую хату маруператварыць у вясковую арт-прастору, дзе можна сабрацца, пасядзець, паспяваць, застацца пераначаваць. На гэта я, напэўна, і патраціў бы тыя долары. Хоць трэба было б, напэўна, на сям'ю. У кожнага мужчыны ёсць нейкая заначка. Жонка ведае пра маю, але дазваляе траціць яе, як мне хочацца.

***— І на што ідуць вашы заначкі, калі не сакрэт?***

— Вам жа Арына ўжо ўсе сакрэты выдала *(смяецца)*. Мая слабасць — гэта народныя строі. Сам купляю тканіну, штосьці выпрошваю, штосьці дораць. Вось гэтая кашулька, напрыклад, пашытая са штор, якія я запрыкмеціў на кухні ў сваёй цёткі. А вось тыя гарсэты — з тканіны, якую мая цешча некалі купіла сабе на халат. Я яе запрыкмеціў, калі мы з дзецьмі былі ў гасцях у Марыі Аляксандраўны. Кажу: «Мне ваша тканінка так падыходзіць». Яна: «Ну забірай». Хапіла яе на тры гарсэты, а трэба было чатыры. Шылі іх у нашым мясцовым атэлье. Прыходжу забіраць, а мне замест трох гарсэтаў працягваюць чатыры. «А што, хапіла?» — здзівіўся. Жанчыны смяюцца. Аказваецца, у закройшчыцы Сямёнаўны такая тканіна была дома. Пахадзіла-падумала, ды выкраіла мне чацвёрты гарсэт. Бабулькі часта завяшчаюць мне свае клункі. Так, Сцепаніда Драбуцька андарак падарыла. Яе дачка кажа: «Забірай». Прыехаў, гляджу, бабуля яго да грудзей прыціснула, аж слёзы на вачах, бо гэта ж маладосць яе. Кажу: «Не, няхай яшчэ пабудзе». Дык яна тады дачцэ сказала: «Як памру, аддай таму чалавеку, бо ты ж спаліш». Мне яго перадалі.

***— У любой незразумелай сітуацыі вы...***

— Спрабую кудысьці зашыцца, схавацца. Калі няма магчымасці выйсці з памяшкання, хаваюся ўнутр сябе. У думках пачынаю спяваць. Апошнім часам пераходжу на малітву.

***— Вы згадалі Бога. Што зрабілі б, калі б сустрэлі яго?***

— Па-першае, сказаў бы дзякуй за тое, што я ёсць, за сям'ю. Не «спасибо», а менавіта «дзякуй». Бо цяпер нават скарачаюць «пасибо». І «спаси Бог» ператварылася ў «паси Бог». Навошта ж нас пасвіць? Па-другое, папрасіў бы, каб ён быў да людзей больш строгім. Бог даў нам вельмі шмат волі. Асабліва цяпер. Такое сабе дазваляем! Бабулькі, якія перажылі вайну, калі моляцца, просяць міру. А я папрасіў бы розуму палітыкам, абсалютна ўсім, тады не будзе вайны. А таксама мудрасці бацькам, тады будуць разумныя дзеці.

■ Не прапусціце!

# КАЗАЧНЫ ДЖЭМ

## Пад такой назвай у Мінску пройдзе незвычайны фестываль для ўсёй сям'і



**Што можа атрымацца, калі ў майстэрню да мамы забяруцца дзве маленькія сястрычкі? Таямнічая швейная машынка раптам ажыве і замахае крыламі, разгоніцца хуткім цягніком і заскрыпіць старым патэфонам. Мамчыны тканіныператворацца ў горы і рэкі, травы і кветкі, маленькія шпулькі запульсуюць, нібы барабанчыкі, а стужкі і клубкі нітак... Але не будзем раскрываць сакрэты, бо лепш убачыць усё на ўласныя вочы. Калі вы яшчэ не вырашылі, як расквеціць гэтыя дажджлівыя вераснёўскія дзянькі, ёсць ідэя. У сталіцу ўжо сёння завітае свята казкі і чараўніцтва. Пройдзе «Казачны джэм» з 21 па 24 верасня адразу на некалькіх пляцоўках.**

Для маленькіх гледачоў і іх бацькоў творчыя калектывы падрыхтавалі свае найлепшыя пастаноўкі як на беларускай, так і на рускай мове. У прыватнасці, бэбі-тэатр «Бусы» пакажа спектакль «Птушка-цягнік-патэфон», тэатр лялек, святла і ценю «Дом сонца» — «Начны садоўнік», лялечны тэатрык «Лямцавая батлейка» — «Хутчэй, Мама Му!», ParadoxPinoccio — «Брыдкае птушаня», студыя «Варгін» — «Касмічныя прыгоды». З Брэста прыедзе калектыў «Напротив», з Віцебска і Салігорска — «Цыбулькавы тэатр». BabyBox — госці з Тулы. У фестывалі прыме ўдзел і Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа, — калектыў пакажа спектакль па гісторыях Сяргея Казлова пра Вожыка і Медзведзяня «Трам! Вітаю!». Усе гэтыя тэатральныя паказы можна паглядзець у Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў (вул. Някрасава, 3).

Паралельна на сцэне дзіцячага тэатра «Кропка» (пр-т Пераможцаў, 9) польскі калектыў Art Fraction Foundation пакажа спектакль-інсталяцыю без слоў «Лабірынт». Гэта пастаноўка для самых маленькіх гледачоў — ад 0 да 3 гадзікаў. Сам жа тэатр «Кропка» падрыхтаваў для дзетак шоу-квэст «Падарожжа ў Ізумрудны горад». Казачны дзень у РНПЦ дзіцячай хірургіі 24 верасня арганізуюць клоўны Funny nouse.

Акрамя тэатральных паказаў усіх наведвальнікаў фестывалю чакаюць чытанні казак уголас ад прафесійных артыстаў, а таксама надзвычай цікавыя творчыя майстэрні. Падчас майстар-класаў дзеткі будуць ствараць цуды сваімі рукамі. І ўсё гэта ў неймаверна казачнай атмасферы.

Па традыцыі («Казачны джэм» ладзіцца ў Мінску ўжо трэці раз), абяцаюць арганізатары фестывалю, на працягу ўсіх чатырох дзён будзе шмат жывой музыкі. У прыватнасці, акцёры і музыканты агучаць казкі на старых плёнках у праекце «Дыяфільм Live». Дарослыя панастальгуюць, а дзеці атрымаюць магчымасць зазірнуць у дзяцінства бацькоў, бабуль і дзядуль.

«Казачны джэм» — унікальная магчымасць для бацькоў і іх дзетак убачыць адразу некалькі спектакляў, прычым не толькі сталічных тэатральных калектываў, але і прыезджых. А таксама адкрыць для сябе новыя дзіцячыя кнігі беларускіх і замежных аўтараў. Апроч таго, фестываль можа натхніць бацькоў на творчае выхаванне сваіх дзетак, пераствараць іх у сапраўдных чараўнікоў. Менавіта з гэтай мэтай у пятніцу вечарам для тых мам і татаў, якім цікава паспрабаваць стварыць дома сямейны тэатр, запланаваны бясплатны майстар-клас.

Звычайна тэатральныя фестывалі разлічаны на шырокую аўдыторыю, праз іх за дзень праходзяць тысячы людзей. Але «Казачны джэм» — выключэнне. Гэта вельмі камерны фестываль, яго могуць наведаць толькі 50 сем'яў у дзень. Усё гэта зроблена для таго, каб захаваць сямейную атмасферу свята, каб дзеткам было камфортна знаёміцца з тэатральным мастацтвам.

**Надзея ДРЫЛА.**
*nadzieja@zviazda.by*

# ГУЛЯЦЬ ДЫК ГУЛЯЦЬ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Цікава, што ў эпоху, калі існуе такая вялікая колькасць забаў, настольныя гульні не толькі не страчваюць сваёй папулярнасці, але і штогод набіраюць усё больш прыхільнікаў сярод шматлікіх сем'яў і кампаній сяброў. І гэта не выпадкова.

Настольныя гульні маюць надта глыбокія карані, каб быць выцесненымі сучаснымі забавамі: лічыцца, што першая настолка з'явілася яшчэ ў Старажытным Егіпце 5500 гадоў таму. Гэта гульня шашачнага тыпу мела назву Сенет, і лічылася, што яе вынайшаў бог ведаў Тот.

Колькі ж усяго з тых часоў чалавецтва вынайшла настольных гульняў, падлічыць, пэўна, немагчыма. Дакладна вядома, што самую вялікую калекцыю — болей за 20 тысяч — настольных гульняў сабраў амерыканец Кен Фанароў. А, напрыклад, гульня «Го» да гэтага часу застаецца адзінай гульнёй, у якой камп'ютар не можа перамагчы чэмпіёнаў па аматарскім узроўні.



Фота Надзеі БУЖАН.

**Сям'я ГЛОТАВЫХ часта бавіць час за настольнымі гульнямі.**

Штогод на рынак і ў нашы дамы прыходзяць усё новыя гульні, якія становяцца не проста забавамі. Многія з іх вучаць нас нейкім карысным у рэальным жыцці навыкам. Самы яркі прыклад таму — «Манаполія», якая паказвае асновы эканамічнай стратэгіі і дапамагае арыентавацца ў эканамічнай сферы жыцця і з розумам распараджацца капіталам. Сімвалічна, што Чарльз Дэрроў выпусціў «Манаполію» ў ЗША ў 1935 годзе, калі шэраг краін перажывалі эканамічны крызіс — Вялікую дэпрэсію. А ўжо ў 1936-м «Манаполія» стала самай папулярнай гульнёй у Амерыцы.

Акцёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага Уладзімір Глотаў і яго жонка артыстка і рэжысёр дзіцячага тэатра «Бусы» Злата са сваімі дочкамі Яснай і Летай вельмі часта разам бавяць час за настольнымі гульнямі. «Гуляем вечарамі, калі дождж, напрыклад, — кажа Уладзімір. — Або калі кудысьці паедзем, таксама заўсёды бяром настолкі з сабой». «Залежыць ад умоў, але звычайна гуляем мы па некалькі партый, — дадае Злата. — Гэта ж не проста пагулялі-разышліся, заўсёды каму-небудзь хочацца адыгрaцца». Часам дзяўчаткі гуляюць удзвюх, але ж з дарослымі ім цікавей. «Калі гуляюць два чалавекі, гульня зацягваецца ў два разы і ўжо атрымліваецца не так весела. Цікава, калі ёсць дынаміка і прысутнічае спаборніцкі элемент», — лічыць Злата. У сям'і Глотавых шмат настольных гульняў, і зразумела, што сярод іх ёсць свае фавpublic. У пяцёрку любімых увайшлі «Сонная каралева», «Даганi абед», «Румікуб», «Лудо» і «Чарапашыя бягі». На пытанне, як звычайна праходзіць «знаёмства» з новай гульнёй, Ясна адказвае: «Спачатку мы чытаем правілы, а потым, каб было больш зразумела, глядзім відэа, як гуляюць». «Ютуб, вядома, вельмі дапамагае, бо правілы часам напісаны вельмі мудрагеліста, — дадае Уладзімір. — У «Румікуб» мы вельмі доўгі час не гулялі, а зараз гэта адна з любімых нашых гульняў. Многія думаюць, што там вельмі складаныя правілы, а насамрэч усё прасцей, чым падаецца».

Калі гуляеш у настольныя гульні з дзецьмі, мімаволі паўстае тонкае пытанне пра перамогу і пройгрыш. «Часам дзеці моцна засмучаюцца, і мне, як маці, хацелася б, каб перамаглі яны. Але, бывае, так складваецца, што ты не хочаш паддавацца, таму што ўжо ўсе гуляюць на роўных, — каментуе гэтую праблему Злата. — Тут кожны можа чамусьці навучыцца, таму што перамога не становіцца самамэтай, ёсць момант дамоўленасці, г. зн. ісці на кампраміс. Вось, напрыклад, гульня «Лудо» ў перакладзе з кітайскай так і завецца «Не крыўдуй». Вельмі важна, што з дапамогай гэтай настолкі дзеці могуць патрэніравацца ў пройгрышы, і гэты пройгрыш становіцца часткай вопыту. І, вядома, такі вопыт лепш упершыню атрымаць у сям'і».

«Мы можам адразу абмеркаваць, што здарылася, і гэта ператвараецца ўжо у асобную гульню пасля той гульні, — працягвае Уладзімір. — Усё адно пройгрыш — гэта вялікае фіяска для дзяцей, і таму ідзе момант дыспуту з бацькамі. Не часта ж дзецям у школе або дзесьці яшчэ выпадае шанц паспрачацца з дарослымі па-добраму, па-сур'ёзнаму, па-цікаваму, выказаць сваё «не» і абгрунтаваць яго».

Сям'і Глотавых падабаецца не толькі гуляць, але і пазнаваць гісторыю гульняў, бо, як кажа Злата, «нароўні з гульнямі народнага паходжання, ёсць яшчэ і аўтарскія». «Адна дзяўчынка, калі не магла заснуць, пачала выдумляць розных каралёў і каралеў, драконаў і рыцараў, — расказвае Ясна пра стварэнне гульні «Сонная каралева». — Раніцай яна падзялілася гэтым са сваёй сям'ёй. Бацькі распрацавалі правілы гульні, а сястра стварыла ілюстрацыі».

Уладзімір і Злата прызнаюцца: «Ёсць і такія гульні, як «Імаджмарыум», «Аліяс», для якіх дзеці яшчэ маленькія, таму мы ідзём паступова ад самых простых. Затое мы адкрылі цэлы свет настолак, якія б мы, дарослыя, для сябе не купілі б».

Таксама як і любыя структураваныя гульні, настольныя дапамагаюць вызначыць правілы і прытрымлівацца іх, што таксама ў далейшым дапамагае ў вызначэнні і выкананні сямейных абавязкаў і захаванні межаў як для дзяцей, так і для дарослых.

**Псіхолаг Надзея РЖАВУЦКАЯ: «Роля настольных гульняў, як і любых іншых для сумеснага баўлення часу сям'і, дастаткова вялікая, асабліва ў сучасны перыяд гаджэтаў і інтэрнэту. Настолкі дазваляюць непасрэдна ўзаемадзейнічаць адно з адным, уключаца ў здаровую канкурэнцыю, вучаць перамагаць і прайграваць. Гульня павінна быць сапраўды цікавай усім членам сям'і, што дазволіць кожнаму атрымаць асалоду ад яе і гутаркі».**

Радуе, што з кожным годам на палічках у крамах з'яўляецца ўсё больш гульняў на беларускай мове: «Разам», «Казачнік» і г. д. Яны здольныя не толькі прынесці ў ваш дом цудоўныя вечары роднага слова, але і прывіваць дзеткам любоў да мовы. Беларускія настольныя гульні могуць стаць нават своеасаблівым дадаткам да школьнага падручніка: можна знайсці гульні на гістарычную тэматыку, як «Паўстанцы», «1514». А настолка «Мова» дапаможа пашырыць слоўнікавы запас.

І калі наступны раз вы будзеце думаць, як правесці час увечары, то лепш не ўключайце тэлевізар, не набірайце тэлефонны нумар сяброўкі, а проста адчыніце тую кардонную каробку, якая цярпліва чакае вас на паліцы.

**Аляксандра ДАРАШЭНКА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(организатор аукциона)* проводит открытый аукцион по продаже:

по поручению **ОАО «Борисовская швейная фабрика»** (продавец):

**Лот №1: Здание блока вспомогательных цехов**, общ. пл. **1248,9 кв. м**, инв. №610/С-57699, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100001002730 площадью 0,3053 га по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 9/8.

**Начальная цена с НДС (20%) – 73 096,92 бел. руб. *Стоимость снижена на 70%*. Задаток 10% (7 309,00 бел. руб.).**

**Лот №2: Производственный цех,** общ. пл. 1462,1 кв. м, инв. №610/D-61785, по адресу: **г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 9/2-3,** имущество согласно перечню *(с перечнем можно ознакомиться у организатора торгов)*.

**Начальная цена с НДС – 92 328,42 бел. руб. *Стоимость снижена на 75%.* Задаток 10% (9 232,00 бел. руб.).**

**Лот №3: Изолированное помещение** общ. пл. 3 992,4 кв. м, инв. №610/D-65612 по адресу: **г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 9/1-3**.

**Начальная цена с НДС (20%) – 352 540,80 бел. руб. *Стоимость снижена на 40%.* Задаток 10% (35 254,00 бел. руб.).**

по поручению **ОАО «Борисовское предприятие музыкальных инструментов»** *(продавец):*

**Лот №4:** Склад готовой продукции, общ. пл. 717,0 кв. м, инв. №10/С-53933, расположен на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001104 площадью 0,0878 га *(предоставлен на праве аренды)* по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/11.

**Начальная цена с НДС – 35 071,68 бел. руб. *Стоимость снижена на 65%*. Задаток 10% от начальной цены – 3 507,00 бел. руб**.

**Лот №5:** Здание РМЦ, общ. пл. 1161,2 кв. м, инв. №610/С-53918, имущество согласно перечню *(с перечнем можно ознакомиться у организатора торгов),* расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001097 площадью 0,2003 га *(предоставлен на праве аренды)* по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/18.

**Начальная цена с НДС (20%) – 71 852,19 бел. руб. *Стоимость снижена на 75%.* Задаток 10% от начальной цены – 7 185,00 бел. руб.**

**Лот №6:** Пристройка к корпусу №1 *(изготовление футора)*, общ. пл. 1535,4 кв. м, инв. №610/С-53920, имущество согласно перечню *(с перечнем можно ознакомиться у организатора торгов),* расположена на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001098 площадью 0,1064 га *(предоставлен на праве аренды)* по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/23.

**Начальная цена с НДС – 44 385,97 бел. руб. *Стоимость снижена на 75%.* Задаток 10% от начальной цены – 4 438,00 бел. руб.**

**Лот №7:** Участок обработки чугунных рам, общ. пл. 507,5 кв. м, инв. №10/С-53931, имущество согласно перечню *(с перечнем можно ознакомиться у организатора торгов),* расположен на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001096 площадью 0,1429 га *(предоставлен на праве аренды)* по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/22.

**Начальная цена с НДС – 12 036,43 бел. руб. *Стоимость снижена на 75%.* Задаток 10% от начальной цены – 1 203,00 бел. руб.**

**Лот №8:** Электроцех, цех раскроя фанеры, компрессорная общ. пл. 639,2 кв. м, инв. №610/С-53929, имущество согласно перечню *(с перечнем можно ознакомиться у организатора торгов)* расположен на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001095 площадью 0,1457 га *(предоставлен на праве аренды)* по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/17.

**Начальная цена с НДС – 55 590,93 бел. руб. *Стоимость снижена на 75%.* Задаток 10% от начальной цены – 5 559,00 бел. руб.**

Абсурднасць фільма «мама!» ідзе па нарастаючай, дзіўна бачыць першародны грэх, смерць Авеля, нараджэнне Божага сына ў антуражы звычайнага, чалавечага, сучаснага. Глабальнасць быццам нівелюецца, затое гэты метад дазваляе паглядзець на гісторыі са свяшчэннай кнігі з іншага боку. І, трэба сказаць, пакуль мы бачым сюжэт праз жанчыну, свет якой патроху разбураецца, фільм не адпускае і не дазваляе паглядзець на гадзіннік. Затое Божая любоў раптам набывае іншы налёт; словы пра тое, што людзям трэба даравацы забойства сына, выглядаюць ідыятычнымі; адносіны паміж Богам і веруючымі параўноўваюцца з таленавітым паэтам і яго фанатамі.

Нягледзячы на жудасную самога фільма, калі пакапацца — выяўляецца, што Аранофскі заклаў у карціну нехілы гумарыстычны падмурак. І хоць у карціне «мама!» сэрца, што кахае, становіцца надзвычайнай прыгажосці жываватворным алмазам (ну што за банальнасць!), у хітраспляценнях і інтэрпрэтацыях Аранофскі сапраўды цікава разбірацца.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

# МІНУЛАЕ... З ТЭАТРАЛЬНЫМ УХІЛАМ

## Школьны музей і фарміраванне светапогляду чалавека

**Даўно збіралася выказаць такое сваё меркаванне: ні гучнасць назвы, ні плошча экспазіцыі, ні тэрмін існавання, ні тэма, ні прысвячэнне, ні розныя іншыя акалічнасці не гарантуюць музею таго, што забяспечыць яму пазіцыя заснавальніка, гаспадара. Асаблівая папулярнасць назіраецца ў стане школьных музеяў, якіх у маёй калекцыі налічваецца нямала. Некаторыя з іх, рэалізуючы самыя смелыя ідэі, выпраменьваюць нешта такое, пра што іншыя нават не мараць. Для ілюстрацыі тут вельмі падыходзіць музей сярэдняй школы ў пасёлку Гудагай.**



Эпізод пабытавай сцэнкі «Вясковая сям'я ў зімовы вечар».

Не малады, але і не стары — заснаваны больш чым дзесяць гадоў таму, па кірунку — гісторыка-краязнаўчы, якіх большасць, па плошчы — чвэрць сотні квадратных метраў пад адным памяшканнем, на якое ўскладзены тым не меней тры ролі адразу: экспазіцыйнай залы, кабінета для падрыхтоўкі юных экскурсаводаў і тэатральнай студыі.

Этнаграфічны збор музея сам па сабе традыцыйны (прадметы побыту мінулага часу), але прадстаўлены досыць нетрадыцыйна — супрацоўнікі музея (так трэба называць гэтых вучняў) паставілі па ўласным сцэнары побытавую сцэнку, у якой праз дзеянні і дыялогі герояў паказаны не толькі прадметы штодзённага вясковага ўжытку 1950-х гадоў, але і варункі і клопаты таго часу. Літаральна за імгненні прастора кабінета-музея ператвараецца ў сцэну і глядзельную залу, а экскурсаводы — у артыстаў. І вось Агнеса Кошчыц у ролі маці прасуе бялізну драўляным прасам, Аляксандр Жалток у ролі бацькі штосьці вымярае вялізным драўляным цыркулем, Мікіта Вішнеўскі, дзядуля, таўчэ ў ступцы зерне, Вераніка Лапшэвіч, бабуля, збівае масла, Вікторыя Мілешка, малодшая дачка, гуляе з самаробнымі лялькамі, Павел Казлоўскі, сын, уваходзіць у хату з каромыслам на плячы... Кіраўнік музея Марыя Карлаўна Васілёнак упэўнена, што побытавая сцэнка «Вясковая сям'я ў зімовы вечар» можа выкарыстоўвацца настаўнікамі ўстаноў адукацыі Астравецкага раёна, а таксама суседніх Ашмянскага і Смаргонскага для знаёмства з мясцовымі традыцыямі, хатнім убраннем і асаблівасцямі ранейшай тутэйшай мовы — ад дыялектаў да спосабу вымаўлення імён. А гэта ўжо, між іншым, сапраўдная навукова-асветніцкая дзейнасць.

Вучні, якія займаюцца ў гуртку экскурсаводаў, прымаюць удзел у краязнаўчых даследаваннях і самі ствараюць тэксты экскурсій. Праводзяцца яны для школьнікаў сваёй і іншых школ, мясцовага насельніцтва і гасцей, арганізацый-шэфаў і ўсіх ахвотных. Экскурсійных груп дзве — малодшая, якая працуе першы год, і старэйшая, якая мае, як кажуць, напрацаваны голас.

А хросным бацькам тут лічыцца былы вучань Адам па прозвішчы Мальдзіс, жыццю і дзейнасці якога адведзены ў экспазіцыі асобны стэнд.

Слухаючы пра Гудагай — вёску і станцыю на першай каляі Лібава-Роменскай, пра абраз Маці Божай Гудагайскай і іншыя цікавосткі, зайздрошчу таленту непасрэднасці ў складанні і агучванні аповедаў.

— Мэта сённяшняй экскурсіі — паказаць, якія шырокія магчымасці мае нават школьны музей у фарміраванні светапогляду чалавека, — гаворыць Арына Лаўрэцкая.

Міжволі задумваешся: ці шмат мы ведаем экскурсаводаў, словы якіх праходзяць не толькі праз вушы?

**Святлана ВОЦІНАВА.**

■ Скарбніцы архіваў

# ЗАХАВАЦЬ, КАБ УСПОМНІЦЬ

У фае бібліятэкі чуем ціхі напеў гітары. Лірычная мелодыя далёкіх часоў надае дзеламову інтэр'еру хатнюю ўтульнасць.

— Запрашаем, адчувайце сябе як дома, — вітаюць гасцей дзяўчаты ў сукенках



**Загадчыца аддзела выкарыстання дакументаў і інфармацыі дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў Таццяна РАХМАНЬКО знаёміць з фотаальбомамі 50-х гадоў.**

даўно забытага фасону. Даўно забытыя рэчы вы бачыце і ў пакоі: на сталe з самаробным бялюткім настольнікам размясціўся вялікі радыёпрыёмнік, лямпа з узорыстым абажурам, старамодны тэлефон... Побач альбомы з фотаздымкамі, якія, нібы акенцы ў далёкі час, даюць зазірнуць і ўбачыць Мінск 50-х гадоў мінулага стагоддзя.

Мы знаходзімся ў мінскай цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы, а тое, што са здзіўленнем бачым вакол сябе і чуем, — гэта выстаўка «Мінск. Пачатак 50-х. Яфім Ліўшыц». Аўтар жыў і працаваў у сталіцы паўстагоддзя таму. Было ў гэтага чалавека захапленне: фатаграфаваць родны горад, будынкі якога ў той час дзе-нідзе яшчэ захоўвалі сляды вайны, а вуліцы і плошчы ўжо ўпрыгожваліся новабудоўлямі.

Гэта фотакалекцыя — адна з шматлікіх, якія знаходзяцца ў Беларускім дзяржаўным архіве кінафотафонадакументаў. Паказаць яе мінчанам і гасцям сталіцы супрацоўнікі архіва і бібліятэкі вырашылі з дапамогай нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», — менавіта там для інтэр'ера экспазіцыі ў сховішчах падабралі адпаведныя старыя рэчы, а для маладых супрацоўніц бібліятэкі на час адкрыцця выстаўкі перадалі сукенкі, пашытыя па тагачасных фасонах. Да таго ж у зале былі паказаны архіўныя кінастужкі беларускіх дакументалістаў.

Зрэшты, зрабіць падарожжа ў мінулае — сёння не праблема.




У зале выстаўкі.

Музеі, выставачныя залы, экспазіцыі на вуліцах даюць нам магчымасць з лёгкасцю крутнуць уяўны штурвал машыны часу. Але не ўсюды гэта дасягаецца дзякуючы супрацоўніцтву зацікаўленых майстроў з розных галін. Архівісты, бібліятэкары, кінематаграфісты ажыццявілі ўдалы праект, у якім яскрава спалучаюцца гістарычная канкрэтыка і рамантычная фантазія.

**Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара**

■ Шык-шок

# ПОЗІРК НАЗАД



## Гісторык моды Аляксандр Васільеў — пра свае беларускія карані, жаданне жанчын «сфоткацца» з ім, унісекс і лабутэны

**Да 10 студзеня ў Нацыянальным гістарычным музеі будзе працаваць унікальная выстава «Моднае стагоддзе», на якой прадстаўлены гістарычныя касцюмы з найбуйнейшай у свеце прыватнай калекцыі вядомага гісторыка моды, мастацтвазнаўца, калекцыянера, тэатральнага мастака, тэлевядучага праграмы «Модны прысуд».**
**Экспазіцыя адзення і аксесуараў, якая ахоплівае канец XIX—XX стагоддзяў, складаецца з больш як сотні касцюмаў і некалькіх соцень разнастайных аксесуараў, ювелірных вырабаў, біжутэрыі. Тут можна ўбачыць сапраўды ўнікальныя строі ад Поля Пуарэ, Како Шанэль, Іва Сэн-Ларана і іншых майстроў. У залах музея выстаўлены вячэрнія і бальныя сукенкі, адзенне для ўрачыстых цырымоній, касцюмы вядомых артыстаў тэатра і кіно — Маі Плісецкай, Вольгі Лепяшынскай, Наталлі Фацеевай, Нані Брэгвадзэ, Лаймы Вайкуле...**

Кожная рэч на выставе красамоўна распавядзе аб часе свайго стварэння. Гарманічныя строі канца XIX стагоддзя заўважна зменяцца на пачатку XX стагоддзя. Галоўная рэформа жаночай сукенкі — вызваленне ад гарсэта — адбудзецца дзякуючы парыжскаму куцюр'е Полю Пуарэ. Не паспее ў першым дзесяцігоддзі XX стагоддзя замацавацца вытанчаная эстэтыка моды «Выдатнай эпохі», як ужо ў 1914 годзе з пачаткам Першай сусветнай вайны аб сабе заявяць зручнасць і практычнасць. Затым пасядзе эклектычны стыль ар-дэко 20-х гадоў і эмансіпацыя, якая дала жанчынам новую свабоду ў адзенні. Далей — элегантныя 30-я пад кіраўніцтвам куцюр'е Эльзы Ск'япарэлі, затым — трагічныя 40-я з падкрэсленай прастатой знешняга выгляду і ваеннымі матывамі. Апошняе вялікае дзесяцігоддзе Высокай моды — 50-я гады — пройшло пад знакам Крысціяна Дыёра, Крыстабаля Баленсіягі, Сальваторэ Ферагама і стылю New Look. За гэтым — мінімалізм і футурызм 60-х (П'ер Кардэн, Іў Сэн-Ларан, Эміліа Пучы, Пака Рабан), свабода 70-х гадоў з унісексам, хіпі, глэм-рокам, дыска (Гі Ларош, Кенза Такада). 80-я выбухнулі яркімі фарбамі і жаданнем самавыражэння, а 90-я змянілі ўсе прынцыпы моднай індустрыі, далі нам адзенне, якое парадаксальным чынам спалучае функцыянальнасць і падкрэсленую тэатральнасць (Аляксандр МакКуін, Ісей Міяке, Жан-Поль Гацье).

Аляксандр Васільеў — стваральнік дэкарацый для опер, тэатральных пастановак, фільмаў і балетаў для многіх тэатраў і труп. Ён выхоўваўся ў тэатральным асяроддзі, і ўжо ў пяць гадоў стварыў першыя касцюмы і дэкарацыі для лялечнага тэатра. Першы спектакль-казку «Чараўнік Ізумруднага горада» аформіў у 12 гадоў. На юнага мастака моцна паўплываў яго бацька — дэкаратар і стваральнік сцэнічных касцюмаў для Любові Арловай, Фаіны Раненскай, Ігара Ільінскага. У 22 гады скончыў школу-студыю Маскоўскага мастацкага тэатра. Працаваў у Парыжы, з ім супрацоўнічалі тэатры Вялікабрытаніі, Японіі, Мексікі. А калекцыянерам стаў у восем гадоў, калі пасля ўрокаў знайшоў у двары дома аднаго з завулкаў Масквы ікону Мікалая Цудатворца XVIII стагоддзя. З таго моманту хлопчык пастаянна прагульваўся... па сметніках, бо Масквы тады разбуралі, з камунальных кватэр жыхары пераязджалі ў малагабарытныя «хрушчобы» і выкідвалі ўсё «старое».

Перад адкрыццём мінскай выставы Аляксандр Васільеў сустрэўся з журналістамі і адказаў на шматлікія пытанні. Майстар трапна заўважыў, што на мерапрыемства збярэцца істотная колькасць прадстаўніц прыгожага полу, каб паглядзець не толькі на сукенку Плісецкай ад Шанэль, але і на яго самога. Што і казаць, сярод журналістаў таксама нямала аказалася тых, хто хацеў яго разгледзець. І распытаць, вядома ж, пра сёе-тое. Яго адказы былі лаканічныя.

«Я быў тут шмат разоў, праводзіў лекцыі, семінары. Мой дзед нарадзіўся ў Маладзечне, я з роду Гулевічаў. Маці нарадзілася на Магілёўшчыне, на дачы ў вёсцы Шацілкі. Так што ў мяне ёсць карані, звязаныя з вашай краінай».

«Усе касцюмы вельмі цяжка захоўваць, рэстаўрыраваць. Той жа шоўк вельмі дрэнна пераносіць час, разбураецца хутчэй за іншыя тканіны... Што было займець цяжэй за ўсё, дык гэта туфлі Любові Арловай, іх давялося клянчыць 25 гадоў. Але паколькі ў мяне шмат часу і цярпення, што важна для калекцыянера, то я ніколі не кідаю задуманага».

«За апошнія пару стагоддзяў вельмі змянілася вытворчасць, і многія дэталі больш не вырабляюцца — сучасны бісер зусім не такога колеру, якасці, фармату. Адшукаць тагачасныя матэрыялы вельмі цяжка, але менавіта гэта і ёсць музейны ўзровень».

«Некаторыя сукенкі на гэтых манекенах не зашпіліліся. Па той прычыне, што аб'ём таліі XIX стагоддзя — гэта 48—53 см. Манекены такога фармату робяцца выключна ў музейных майстэрнях. Але не ўсе краіны і гарады маюць падобны вопыт. У нас была выстава напалеонаўскай эпохі, дзе сукенкі настолькі малыя, што нават на падлеткавых манекенах не сыходзіліся. Людзі ж вельмі выраслі за апошнія дзвесце гадоў. Не марце прымераць гэтыя сукенкі — яны ні на кім не зашпіляцца. Нармальны памер нагі сучаснай жанчыны — 41! Мы сталі зусім іншыя».

«У калекцыі ёсць і сукенка вашай зямлячкі, «Каралевы прыгажосці» Анжалікі Агурбаш, а таксама спявачкі Алёны Свірыдавай. І нават ёсць сукенка пачатку 1960-х маёй мамы, актрысы, вельмі эфектнай жанчыны — Тацяны Гулевіч, яна побач з манто Лілі Брык».

«Зараз у мяне працуе ў розных краінах дзевяць выставак, у Мінску — дзясятая. Затым наступная адкрыецца ў кастрычніку ў Баку — «Мадэрнізм і мода 1960-х гадоў». Свайго моманту чакаюць іншыя выставы, напрыклад, шлюбнай сукенкі. Людзі любяць хадзіць і глядзець на ўнікальныя рэчы, бо яны па-за канкурэнцыяй».

«Прыгажосць могуць ацаніць усе. Акрамя таго, людзі любяць «фоткацца» са мной, яшчэ лепш — прыцісяуцца да мяне, ацаніць, які я — стары? Малады? Высокі? Стройны? Жанчыны любяць глядзець з практычнага погляду на мае экспазіцыі — ці падышло б гэта асабіста ім... Але галоўнае — паглядзець на Яго: «Апішы Яго — ну які ён?»

«Прамы кантакт з канкрэтнымі рэчамі ніякі інтэрнэт не заменіць. У любым выпадку інтэрнэт заўсёды скажае колер, там ёсць і фоташоп. І наогул, магу вам сказаць, што на тую тэму, якая мяне цікавіць, я ў гугле адказу знайсці не магу. Там ёсць адказы на папулярныя пытанні, але ёсць пытанні, якія цікавяць спецыялістаў».

«Мужчыны такія неахайныя, што зношваюць свой гардэроб. Як правіла, усе мужчынскія штаны ад касцюмаў не захоўваюцца — іх праседжваюць. А пасля яшчэ данашваюць на дачы ці ў гаражы. А жанчыны часта носяць рэч усяго адзін раз, бо хочуць пасля паказаць, што ў гэтым яны былі ў тэатры, а ў гэтым цалаваліся... Многія перадаюць свае строі ў спадчыну, асабліва ў краінах, дзе людзі могуць пражываць у вялікіх кватэрах. У Францыі большасць людзей пражываюць у малагабарытных кватэрах, дзе няма антрэсоляў. Нягледзячы на тое, што французы — заканадаўцы моды, яны страшна адмоўна ставяцца да старамоднага адзення. Аддаюць, выкідваюць. А амерыканцы і англічане захоўваюць, нават пішуць запіскі: гэтыя шкарпэткі прадзед насіў у 1843 годзе... Такія рэчы з анатацыямі часта трапляюцца на аўкцыёне — самым лепшым месцы для набыцця рэчаў. Таму што ні на якім блышыным рынку мы не знойдзем рэчы 1920-х».



«Галоўны трэнд сучаснасці — дзіравыя штаны, джынсы. Беднасць, узведзеная ў ранг элегантнасці. Па гэтым калісьці і будуць меркаваць аб рэчах 2017 года. Вярталіся ўжо і высокая талія, і нізкая, і плечыкі, і іх адсутнасць, і палоска, і клетка... Хочаце штосьці новае? Новага не будзе. Можна прыдумаць з вядомых кампанентаў новы салацік — адсюль новы смак. Так і з модай».

«Рускай моды не існуе. Ёсць рускі стыль. Руская мода заўсёды пераймала — галандскую моду, нямецкую, французскую, англійскую. Мы прыцягваем не як краіна — заканадаўца моды, а як крыніца вялікага стылю. Народны касцюм у Расіі існуе хіба ў танцавальных ансамблях — з сучасных матэрыялаў, сінтэтычнага жэмчугу, пластмасавых камянёў, што не мае дачынення да нацыянальнага адзення. Носьбіты нацыянальнага касцюма ёсць у Іспаніі, Аўстрыі, Японіі, Індыі, Шатландыі, дзе людзі носяць такое адзенне. У рэальным жыцці расійскія жанчыны не носяць сарафаны, а мужчыны — касавароткі».

«Усе, хто сядзіць перада мной, апрануты ў трыкатаж. Трыкатаж можа насіць чалавек любога полу. Футболкі, пуловер, світар... У дзяўчынак кветачка, а ў хлопчыкаў няма. Гэта ўнісекс. І гаварыць «як гэта так? чаму ўнісекс?» не выпадае. Хіба жанчыны не ўкралі ў мужчын літаральна ўсё, уключаючы падцяжкі? А цяпер вы гаруеце, што мужчыны пачынаюць штосьці адбіраць у вас? А навошта самі забіралі? Мужчынам стала сумна, і многія дызайнеры прадстаўляюць сёння шоўкавыя сукенкі для мужчын. Гэта не будзе пакуль шырока папулярнае, але я бачыў ужо штук дзесяць такіх калекцый. Беларусь у гэтым сэнсе больш кансерватыўная, але пройдзе час, і адбудуцца нейкія перамены».

«Самыя выгадныя інвестыцыі — гэта мода нядаўняга мінулага, яна заўсёды каштуе вельмі танна. Цяпер 2000-я не ў модзе, а рэчы 1990-х ужо каштуюць дорага. Рэкорды продажу б'е прыжыццёвы Версачэ, тое, што рабіў у свой час Гальяна. 2000-я пакуль нікому не патрэбны, а знакамітыя яны сваім стылем порна-шыку — усё ў стразіках, кароткія спадніцы, джынсы ў абцяжку, абцасы па 20 см. І зараз такую рэч можна адшукаць за тры еўра. Хутка ў сэканд-хэндах з'явяцца і лабутэны з іх чырвонай падэшвай. Пасля знакамітай песні яны рэзка выйшлі з моды, паколькі сталі ўвасабленнем вульгарызму. Я набуду такую пару».

«Брэндавае адзенне шыецца ў Кітаі. І вытворчасць практычна любой рэчы там каштуе каля 2—3 еўра за прадмет. А ў магазіне 200—300 еўра. Калі ж гаварыць пра куцюр, то сукенка можа каштаваць ад 20 да 60 тысяч еўра. Гэта цана кватэры ў Мінску. Толькі ў сукенцы нельга жыць».

«Амаль усе касцюмы стварае для мяне дызайнер Кірыл Гасілін, які ведае мае меркі. Ён мне пашыў вельмі шмат касцюмаў. Да вас я апрануў пінжак у буйны гарох — модны зараз трэнд».



***Пасля сустрэчы Аляксандра Васільева чакаў прыемны сюрпрыз — Ядвіга Паплаўская завітала ў музей, каб не проста азнаёміцца з выставай, але і перадаць маэстра канцэртны касцюм з гальштукам сіняга колеру Аляксандра Ціхановіча і свой уласны канцэртны касцюм жоўтага колеру.***

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

*protas@zviazda.by*

# ГЕНІЙ ЭЛЕКТРЫЧНАСЦІ АБО ВЯЛІКІ ЛЕТУЦЕННІК?

## Нікола Тэсла збіраўся перадаваць без правадоў энергію на адлегласць яшчэ ў канцы XIX стагоддзя

**Калі звычайнага чалавека спытаць, каго ён ведае з родапачынальнікаў эпохі электрычнага току, святла і лямпаў напальвання, то пераважная большасць успомніць (з тых, хто ведае) знакамітага Томаса Эдысана, і мала хто — Ніколу Тэслу, вучонага-фізіка, у гонар якога названая адзінка магнітнай індукцыі і прозвішча якога зараз на слыху толькі ў сувязі з назвай маркі дарагога электрамабіля. Чамусьці Тэслу не вельмі ўспамінаюць на старонках школьных падручнікаў фізікі, хоць без яго работ, адкрыццяў і вынаходніцтваў цяжка ўявіць сабе існаванне штодзённых рэчаў, такіх як, напрыклад, электраток у нашых кватэрах. Падобна Ламаносаву, Нікола Тэсла апярэдзіў свой час і не атрымаў заслужанага прызнання пры жыцці, зрэшты, і дагэтуль яго працы не ацэнены належным чынам.**



Апачалося ўсё ў 1856 годзе ў невялікім сяле Смілян (цяпер — тэрыторыя Харватыі): у сям'і сербскага праваслаўнага святара нарадзіўся чацвёрты сын, якога ахрысцілі Ніколам. Навучыўшыся чытаць, хлопчык літаральна «праглынаў» кнігі адну за адной, часта чытаючы начамі. З'яўляючыся студэнтам Пражскага ўніверсітэта, ужо на другім курсе малады Тэсла выпучае ідэю індукцыйнага генератара пераменнага току. Аднак універсітэцкія прафесары палічылі гэтую ідэю шаленствам і трызненнем. Але гэты адмоўны вердыкт вучоных мужоў толькі падахвоціў вынаходніка, і ўжо ў 1882 годзе была пабудавана дзеючая мадэль.

Тэсла аж гарэў ад жадання ўвасобіць сваё дзецішча ў рэальнай прамысловай установцы. Ён з'язджае ў ЗША і проста з карабля накіроўваецца да знакамітага ўжо тады Томаса Эдысана — вынаходніка электрычнай лямпачкі, вугальнага мікрафона, фанографа і дынамамашыны. Дзякуючы атрыманым на іх патэнтам Эдысан у той час ужо паспеў праславіцца і разбагацець. Знакаміты вынаходнік выслухаў маладога эмігранта і хоць паставіўся да яго ідэі даволі халаднавата, усё ж прапанаваў яму работу ў сваёй лабараторыі. Прахалоднае стаўленне да ідэі генератара пераменнага току тлумачылася проста: усе вынаходкі і ўсе навуковыя распрацоўкі Эдысана грунтаваліся на выкарыстанні пастаяннага току, аб пераменным ён і чуць не хацеў. Але ўжо ў кастрычніку 1887 года, не перастаючы працаваць на Эдысана, Нікола Тэсла здолеў атрымаць патэнт на сваё вынаходніцтва. Эдысан «адчуў» небяспечнага канкурэнта і публічна стаў яго крытыкаваць. Таксама ён паабяцаў Тэслу $50 000 за складаную і вельмі важную для кампаніі работу, а калі апошні паспяхова з ёй справіўся, проста адмовіўся плаціць, заявіўшы, што эмігрант, мабыць, дрэнна разумее англійскую мову і амерыканскі гумар. Навукоўцы рассталіся ворагамі, Тэсла апынуўся на вуліцы без працы і без грошай.



Лабараторыя ў Каларада-Спрынгс.

Але таленту пашанцавала. Здолеўшы зацікавіць некаторых бізнесменаў, Тэсла неўзабаве адкрывае сваю ўласную фірму Tesla Electric Light Company, заключае кантракт з фірмай мільянера Вестынгаўза Westinghouse Electric і нават удзельнічае ў будаванні ГЭС на Ніягарскім вадаспадзе.

90-я гады XIX стагоддзя адзначыліся зацятай барацьбой дзвюх кампаній. З аднаго боку гэта была General Electric, што адстойвала інтарэсы Эдысана, які з'яўляўся прыхільнікам выкарыстання пастаяннага току. Ёй процістаяла Westinghouse Electric, якая стварала сваю прадукцыю на аснове шматлікіх патэнтаў Ніколы Тэслы ў галіне пераменнага току. Гэты час увайшоў у гісторыю прамысловасці, як «Перыяд трансфарматарных бітваў». Нанятыя General Electric журналісты ў прэсе распаўсюджвалі пра пераменны ток усялякія небыліцы. У 1887 годзе ў Нью-Джэрсі Эдысан доўга выступаў перад публікай, ганьбіў сваіх канкурэнтаў Тэслу і Вестынгаўза, а потым падключыў да генератара вытворчасці Westinghouse Electric, якія выпрацоўваюць ток у 1000 вольт, металічную пласціну, на якую папярэдне змясціў з тузін жывёл. Тыя загінулі. У 1888 годзе, калі нью-ёркскія ўлады шукалі больш гуманны від смяротнага пакарання, Эдысан выступаў за тое, каб было абранае электрычнае крэсла «на пераменным току». Ён лічыў, што нармальны чалавек не захоча карыстацца прыборам, «выкананым па тэхналогіі электрычнага крэсла».

Але нястомны Тэсла прыдумаў эфектны ход у адказ. Яго прадстаўленне, якое адбылося на Сусветнай выстаўцы 1893 года ў Чыкага, узрушыла ўвесь свет. Са спакойным выглядам ён прапускаў цераз сябе пераменны ток напружаннем у мільёны вольт — маланкі скакалі па паверхні яго скуры, але сам ён заставаўся непашкоджаным. А калі ахоплены электрычнымі разрадамі «вар'ят» з усмешкай браў у рукі не падключаныя ні да якіх правадоў лямпы напальвання (між іншым — Эдысана!), яны паслухмяна загараліся ў яго руках. Гэта здавалася сапраўдным чараўніцтвам. І гэта пры тым, што раней у шматлікіх выступленнях Эдысан заяўляў, што пераменны ток высокага напружання заб'е любога, хто дакранецца да правадоў!

ТЭСЛА працягваў навуковыя пошукі з маніякальнай упартасцю. Частка яго ідэй увасаблялася ў выглядзе шматлікіх патэнтаў на вынаходніцтвы. У лекцыі, якая адбылася ў 1893 годзе ў Франклінаўскім універсітэце (Філадэльфія), Тэсла выказаўся пра магчымасць практычнага прымянення электрамагнітных хваль. «Я хацеў бы сказаць некалькі слоў аб прадмеце, які ўвесь час у мяне ў галаве, які закранае дабрабыт усіх нас. Я маю на ўвазе перадачу асэнсаваных сігналаў, быць можа, нават энергіі на любую адлегласць зусім без правадоў. З кожным днём я ўсё больш пераконваюся ў практычнай здзяйсняльнасці гэтай схемы». Такія сцвярджэнні не былі галаслоўнымі. Яшчэ ў 1891 годзе падчас эксперыментаў з ваганнямі высокай частаты вучоны стварае адзін з самых арыгінальных прыбораў свайго часу. Тэслу ўдалося злучыць у адной прыладзе ўласцівасці трансфарматара і з'яву рэзанансу. Так былі створаны знакамітыя рэзананс-трансфарматар, які сыграў вялікую ролю ў развіцці многіх галін электратэхнікі, радыётэхнікі і шырока вядомы пад назвай «трансфарматара Тэслы». Вынаходнік прапанаваў выкарыстоўваць рэзананс-трансфарматар з мэтай узбуджэння выпрамяняльніка, паднятага высока над зямлёй і здольнага перадаваць энергію высокай частаты без правадоў. Калі казаць сучаснай тэрміналогіяй, гаворка ішла аб антэне! Такім чынам, за некалькі гадоў да Папова і Марконі ўжо была рэалізавана ідэя бесправаднай сувязі.

У 1899 годзе ў горным раёне Каларада пры фінансавай падтрымцы сябра Тэсла арганізаваў навуковую лабараторыю. Там, на вышыні дзвюх тысяч метраў над узроўнем мора, ён заняўся вывучэннем навальнічных разрадаў і вызначэння наяўнасці электрычнага зараду зямлі. Ім была створана арыгінальная канструкцыя «ўзмацняльнага перадатчыка» з 60-метровай мачтай, які дазваляе атрымліваць напружанне да некалькіх мільёнаў вольт пры частаце да 150 тысяч перыядаў у секунду. Уключэнне перадатчыка выклікала ў атмасферы навальнічныя разрады з маланкамі даўжынёй да 135 футаў. У час аднаго эксперымента сцены дамоў за некалькі міль ад лабараторыі пачалі вібраваць, і людзі ў паніцы выбеглі на вуліцу. Мясцовыя жыхары ахрысцілі вучонага «вар'яцкім вынаходнікам». І калі пачаліся дзіўныя вібрацыі дамоў, людзі адразу ж западозрылі ў гэтым Тэслу. Была выкліканая паліцыя і рэпарцёры. Вучоны паспеў выключыць і знішчыць свой прыбор. «Я мог бы абрынуць Бруклінскі мост за гадзіну», — прызнаваўся ён пасля. Эксперыменты прыйшлося спыніць.

Потым Тэсла атрымаў фінансавую падтрымку Джона Пірпанта Моргана — аднаго з мільянераў таго часу, які зацікавіўся яго распрацоўкамі. На выдзеленыя грошы ў Нью-Ёрку на востраве Лонг-Айленд была пабудавана лабараторыя па перадачы сігналаў у Еўропу і побач з ёй узведзена вежа вышынёй 57 метраў са сталёвай шахтай, заглыбленай у зямлю на 36 метраў. Вежу ўвенчваў 55-тонны металічны купал дыяметрам 20 метраў. Навуковы праект атрымаў назву Уордэнкліф (Wardenclyffe). Тэсла песціў мару акрамя перадачы сігналаў сур'ёзна заняцца ажыццяўленнем перадачы энергіі на адлегласць. Хітры фізік схаваў ад Моргана, што вежа прызначалася не толькі для трансляцыі радыёхваль, але і для бесправаднай перадачы электрычнасці. Як толькі Морган гэта зразумеў, ён тут жа адмовіў Тэслу ў фінансаванні. Бо гэта вынаходніцтва магло абрынуць рынак энергетыкі: хто будзе купляць тое, што можна атрымліваць практычна бясплатна? З'яўляючыся саўладальнікам першай у свеце Ніягарскай ГЭС і буйных медных заводаў, Морган ніяк не мог такога дапусціць. Вежа Уордэнкліф была законсерваваная ў 1903 годзе, некалькі гадоў стаяла закінутай, а ў 1917 годзе яе ўзарвалі, прыдумаўшы вельмі дзіўную падставу — нібыта яе маглі выкарыстоўваць нямецкія шпіёны. Гэтак жа нельга не згадаць пра тэорыю, паводле якой прычынай выбуху на Падкаменнай Тунгусцы ў Расіі ў 1908 годзе (так званы Тунгускі метэарыт) мог быць і праект Уордэнкліф. Па іншай версіі, з дапамогай Уордэнкліф Тэсла збіраўся асвятліць небасхіл Роберту Піры, які прабіраўся ў арктычнай цемры да Паўночнага полюса. Аднак гэтыя версіі не вытрымліваюць крытыкі, таму што падзенне Тунгускага цела адбылося 30 чэрвеня 1908 года, а Роберт Піры адправіўся на полюс 20 лютага 1909-га.



Лабараторыя Wardenclyffe ў Нью-Ёрку.

ПРЫСУДЖЭННЕ Нобелеўскай прэміі па фізіцы за 1915 год выклікала ўсеагульнае здзіўленне: напярэдадні «Нью-Ёрк Таймс» напісала, што яна будзе падзелена паміж двума людзьмі, амаль ворагамі — Тэслам і Эдысанам. Хадзіла шмат чутак на гэтую тэму, Тэсла прымаў віншаванні, але збіраўся адмовіцца ад прэміі, каб у гэты час меў неабходнасць у грашах, — ён прынцыпова не хацеў дзяліць гэта прызнанне яго заслуг з Эдысанам. Але праз тыдзень Нобелеўскі камітэт абвясціў, што прэмію па фізіцы атрымліваюць англійскі прафесар Уільям Генры Брэг і яго сын Уільям Лорэнс Брэг — за заслугі ў даследаванні структуры крышталяў з дапамогай рэнтгенаўскіх праменяў. Такім чынам сусветнага прызнання сваіх заслуг Нікола Тэсла так і не атрымаў.

Ішоў час, Тэсла пастарэў, але не пакінуў сваёй мары аб перадачы энергіі без правадоў. У 1931 годзе пры падтрымцы кампаній Pierce-Arrow Co. і General Electric Тэсла зняў бензінавы рухавік з новага аўтамабіля фірмы Pierce-Arrow і замяніў яго стандартным электраматорам пераменнага току магутнасцю ў 80 к. с. (1800 аб/мін.) без якіх бы там ні было традыцыйна вядомых знешніх крыніц сілкавання. Як паведамлялі відавочцы, у мясцовай радыёкраме ён купіў 12 электронных лямпаў, трохі правадоў, жменьку розных рэзістараў і сабраў усю гэтую гаспадарку ў скрыначку даўжынёй 60 см, шырынёй 30 і вышынёй 15 з парай стрыжняў у 7,5 см, якія тырчалі звонку. Умацаваўшы скрыначку ззаду за сядзеннем вадзіцеля ён высунуў стрыжні і абвясціў: «Цяпер у нас ёсць энергія!» Пасля гэтага ён ездзіў на машыне тыдзень, разганяючы яе да 150 км/г. На ўсе пытанні, адкуль жа атрымліваге энергію электрарухавік, Тэсла адказваў: «З эфіру вакол усіх нас». Не паверыўшы яго словам, абывацелі распусцілі чуткі пра тое, што навуковец, так ці інакш, у саюзе з цёмнымі сіламі. Тэслу гэта раззлавала, ён прыбраў таямнічую скрынку з аўтамабіля і вярнуўся ў сваю лабараторыю ў Нью-Ёрку. Таямніца крыніцы энергіі і дагэтуль засталася нераскрытай.

Апошнія гады жыцця Ніколы Тэслы таксама ахутаны таямніцай. Існуюць версіі, што ён займаўся даследаваннямі ў амерыканскай вайсковай карпарацыі RCA. Вядома дакладна, што ён кіраваў праектам N.Terbo (такім было дзявочае прозвішча яго маці). У некаторых крыніцах згадваецца аб праекце «Вясёлка», у рамках якога нібыта быў праведзены вядомы Філадэльфійскі эксперымент. На эсмінец ВМФ ЗША «Элдрыдж» было ўстаноўлена абсталяванне для генерацыі ахоўнага поля, якое дазволіла б зрабіць карабель нябачным для радараў, але ў выніку эксперымента карабель стаў нябачным і для чалавечага вока. Пісалі пра тое, што «Элдрыдж» умомант перамясціўся ў прасторы з аднаго ўзбярэжжа Амерыкі на іншае, што частка экіпажа загінула, частка бясследна знікла, а тыя, што засталіся ў жывых, правялі астатак свайго жыцця ў псіхбальніцах. Аднак пасля ўдалося даказаць, што ніякага эксперымента не было. «Элдрыдж» знаходзіўся тады не ў тым месцы, і, наогул, усё гэта прыдумана адным напаўпісьменным маракам, які ўбачыў, як карабель абмотваюць медным дротам — цалкам рэальны спосаб размагнічвання корпуса, каб не выбухнуць на магнітнай міне.

ТАКСАМА ўвесь свет вельмі цікавіць «д'ябальская зброя» Тэслы. У пачатку XX стагоддзя, а потым у пачатку 1940-х ва ўзросце 84 гадоў вучоны палохаў журналістаў сваім новым вынаходніцтвам. Ён абяцаў накіраваць у іанасферу тонкі, але надзвычай магутны пучок нейкіх часціц або хваль, і тых гэтую іанасферу нагрэюць так, што яна спапяліць праціўніка, які знаходзіцца пад ёй. Такога роду ўстаноўкі існуюць, іх называюць награвальнымі стэндамі, але ніколі не выкарыстоўваюць на поўную магутнасць, па-першае, з-за непрадказальнасці наступстваў для саміх эксперыментатараў і, па-другое, з-за поўнай бессэнсоўнасці такіх эксперыментаў.

Вялікі вучоны памёр у 1943 годзе амаль не пакінуўшы пасля сябе запісаў, дзённікаў і вынікаў даследаванняў. У дачыненні да навуковай спадчыны Тэслы далёка не ўсё зразумела. Некаторыя яго сябры і біёграфы сцвярджалі, што вучоны знішчыў вялікую частку сваіх запісаў на пачатку Другой сусветнай вайны, зразумеўшы, што чалавецтва не гатова выкарыстоўваць яго адкрыцці, і яны, выкарыстаныя як наймагутнейшая зброя, могуць прынесці больш шкоды, чым карысці. Частка сучаснікаў Тэслы, якія працавалі з ім у яго апошнія гады, сцвярджае, што архіў фізіка быў канфіскаваны спецслужбамі адразу ж пасля яго смерці. Гэта таксама адна з версій, ахутаных таямніцай і загадкамі. Больш практычная складаецца ў тым, што паперы Тэслы, якія захаваліся, знаходзяцца ў Бялградскім музеі яго імя, супрацоўнікі якога час ад часу публікуюць іх.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.
hvir@zviazda.by

### Неверагодныя факты пра Ніколу Тэслу

**Тэсла сцвярджаў, што ўначы спіць толькі 2 гадзіны (хоць прызнаваўся, што мог прылегчы адпачыць і днём), а аднойчы правёў за работай 84 гадзіны, не адчуваючы стомы.**

**Ён славіўся геніяльнай фатаграфічнай памяццю, мог запамінаць нават цэлыя кнігі!**

**Згодна з сямейнай легендай, пасля нараджэння хлопчыка бабка-павітуха заявіла, што Ніколу наканавана быць дзіцем цемры (магчыма, таму што ён нарадзіўся ў час навальніцы, а маланка абяцае дрэнны лёс). Яго маці, аднак, на гэта не па-прарочы адказала: «Не, ён будзе дзіцем святла».**

**Адно з дзівацтваў Тэслы заключалася ў тым, што ён ненавідзеў дакранацца да валасоў.**

**У дзяцінстве Ніколу мучылі начныя кашмары, і, як лічаць гісторыкі, пазней у жыцці гэта дапамагло яму ў думках уяўляць свае вынаходкі, прычым вельмі выразна.**

**Ён быў апантаны лікам 3.**

**Тэсла быў заўзятым прыхільнікам гігіены. Як кажуць, гэта было звязана з тым, што ў юнацтве ён захварэў халерай і ледзь не памёр.**

**Адным з самых незвычайных дзівацтваў Тэслы была агіда да круглых прадметаў!**

**Шукаючы фінансавую падтрымку ў Моргана ў 1901 годзе, Тэсла расказаў яму аб сваім новым вынаходніцтве, над якім працаваў, — сотавым тэлефоне! Вядома, назва была іншая, але, па сутнасці, ён меў на ўвазе менавіта сувязь без дроту.**

**У нейкі момант Тэсла ўбачыў у сваім уяўленні і рэнтген, і радар.**

**Ён быў прыхільнікам еўгенікі — селекцыі людзей і кантролю над нараджальнасцю.**

**Тэсла ненавідзеў жэмчуг і пазбягаў гаворкі з жанчынамі, якія насілі жамчужныя ўпрыгажэнні.**

**Ён прытрымліваўся перакананняў, што сямейнае жыццё, нараджэнне дзяцей несумяшчальныя з навуковай працай. Але незадоўга да смерці навуковец прызнаецца, што адмова ад асабістага жыцця была неапраўданай ахвярай.**

# Турызм — найлепшы адпачынак



**Па гарызанталі: 3.** Турызм — ... многіх людзей, але толькі немногія адпраўляюцца ў шлях (прым.). **5.** Прыбор для вымярэння пройдзенай адлегласці ў кроках, які ўваходзіць у экіпіроўку турыста. **9.** Дрэнная ... лепш, чым дрэнны спадарожнік (узбекская прык.). **10.** Кампанія, якая спецыялізуецца на састаўленні турыстычных маршрутаў. **11.** Краіна ў Паўднёвай Амерыцы, дзе наш зямляк, падарожнік, вучоны-даследчык Ігнат Дамейка лічыцца нацыянальным героем. **13.** Лёгкая порыстая вулканічная парода. **16.** Прастора, далягляд. **17.** Даўнейшы народны беларускі струнны музычны інструмент. **18.** Не бойся дарогі, былі б здаровыя ... (прык.). **19.** Мы з табою, як рыба з вадою: ты на дно, а я на ... (прык.). **22.** Поспех. **23.** Рака, правы прыток Прыпяці. **27.** Тая, што знаходзіцца ў дарозе. **30.** Ядомы грыб. **31.** Краіна ў Азіі, у даследаванні якой вызначыўся падарожнік і географ, асветнік М. Пржавальскі, карані роду якога на Беларусі. **32.** Еду ціха — са мной ..., еду скора — са мной гора (прык.).

**Па вертыкалі: 1.** Спецыяльная скрынка з наборам лекаў; рэч, неабходная ў турпаходзе. **2.** Рака на Віцебшчыне, левы прыток Заходняй Дзвіны. **3.** Паўднёваамерыканская расліна і травяны чай з яе. **4.** Цвёрды мінерал. **5.** Ліпкае рэчыва. **6.** Мясцовасць, звычайна глухая (перан.). **7.** Гарадскі пасёлак на Гродзеншчыне, які прыцягвае шматлікіх турыстаў з усяго свету. **8.** Парадаксальная рэч ... ; у сонечны дзень спіна мокрая, а ў лівень сухая (турысцкая прык.). **12.** Тое, што і лісце. **13.** Гарызантальнае перакрыцце ў корпусе судна. **14.** Турысцкі ... . Шлях руху турыстаў. **15.** Іголкападобнае лісце хвойных дрэў і кустоў. **20.** «Турызм як ... — страшна брыдка, але засцягвае». Афарызм невядомага аўтара. **21.** «... — найлепшы адпачынак, але адпачынак лепш за турызм». П. Дах. **24.** Вольнаму — ..., хадзячаму — шлях (прык.). **25.** У рэлігіі звышнатуральная істота . **26.** Запрэжка з двух коней. **27.** Форма ветлівага звароту да грамадзян іншых краін. **28.** Грунт пад вадой вадаёма, ракі, мора. **29.** «Пазнанне краін свету — упрыгожанне і ... чалавечага розуму». Леанарда да Вінчы.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.**

*г. Дзяржынск.*

**Праверце, калі ласка, адказы:**

**Па гарызанталі: 3.** Мара. **5.** Крокамер. **9.** Палка. **10.** Тураператар. **11.** Чылі. **13.** Пемза. **16.** Абсяг. **17.** Ліра. **18.** Ногі. **19.** Бераг. **22.** Удача. **23.** Стыр. **27.** Падарожніца. **30.** Рыжык. **31.** Манголія. **32.** Ліха.

**Па вертыкалі: 1.** Аптэчка. **2.** Ула. **3.** Матэ. **4.** Агат. **5.** Клей. **6.** Кут. **7.** Мір. **8.** Рукзак. **12.** Лістота. **13.** Палуба. **14.** Маршрут. **15.** Ігліца. **20.** Гарэлка. **21.** Турызм. **24.** Воля. **25.** Анёл. **26.** Пара. **27.** Пан. **28.** Дно. **29.** Ежа.

## ■ Будзь у курсе!

### БІЛЕТЫ Ў РАСІЮ: СЕЗОННЫЯ ЗНІЖКІ

**Беларуская чыгунка сумесна з ААТ «Расійскія чыгункі» прапануе ў верасні і кастрычніку сезоннае зніжэнне кошту праезду на цягніках, якія ідуць у зносінах з Расійскай Федэрацыяй. З 18 верасня ў адносінах да жніўня бягучага года зніжэнне складзе каля 20 працэнтаў, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.**

Напрыклад, з названай даты кошт праезду ў купэйным вагоне хуткага цягніка №26 Мінск—Масква знізіцца на 32 рублі і складзе 136,81 рубля, у плацкартным вагоне — на 17 рублёў і складзе 75,32 рубля.

Акрамя таго, захоўваецца і прымяненне зніжак: да 15 працэнтаў — у залежнасці ад тэрмінаў набыцця праязных дакументаў для купэйных вагонаў і вагонаў СВ; 10 працэнтаў — пры праездзе пасажыра на бакавых месцах у плацкартным вагоне; 10 працэнтаў — пры адначасовым афармленні праязных дакументаў «туды і назад» пры праездзе ў вагонах СВ і купэйных вагонах асобных цягнікоў.

Таксама пры праездзе арганізаваных груп пасажыраў захоўваюцца зніжкі да 30 працэнтаў ад агульнага кошту праезду пры набыцці групавога білета ў залежнасці ад колькасці пасажыраў у групе.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

### 21 ВЕРАСНЯ

*Міжнародны дзень міру. У 1981 годзе на XXXVI сесіі Генеральная Асамблея ААН прызнала, што падтрыманне міру як на міжнародным, так і на нацыянальным узроўні з'яўляецца галоўнай мэтай Аб'яднаных Нацый у адпаведнасці са Статутам ААН, і прыняла рашэнне аб мэтазгоднасці абвяшчэння спецыяльнага дня, прысвечанага ўмацаванню ідэалаў міру сярод усіх нацый і народаў. Міжнародны дзень міру 2017 года пройдзе пад дэвізам «Разам на карысць міру: павага, бяспека і годнасць для ўсіх».*

**1792** год — нацыянальны канвент Францыі прыняў дэкрэт аб адхіленні караля Людовіка XVI ад улады. Праз некалькі месяцаў кароль будзе аддадзены пад суд і 21 студзеня 1793 года пакараны на гільяціне.

**1866** год — нарадзіўся Герберт Уэлс, англійскі пісьменнік і публіцыст, родапачынальнік навукова-фантастычнай літаратуры XX стагоддзя і найбуйнейшы майстар крытычнага рэалізму. За сваё творчае жыццё напісаў каля 40 раманаў і вялікую колькасць апавяданняў, некалькі дзясяткаў твораў па філасофскай, сацыялагічнай і гістарычнай праблематыцы з палітычнымі і сацыяльнымі прагнозамі, некалькі кніг для дзяцей і аўтабіяграфію. Творы Уэлса перакладзены на многія мовы свету, па яго раманах пастаўлена некалькі фільмаў. Ён тройчы быў у Расіі — у 1914, 1920 і ў 1934 гадах. Яго гутарка з У. Леніным стала вядомая дзякуючы кнізе «Расія ў змроку» (1920). Практычна ўсё жыццё Уэлс пражыў у Лондане, але часта выступаў з лекцыямі ў многіх гарадах і шмат падарожнічаў, быў двойчы жанаты. Памёр у 1946 годзе ў Лондане.



**1902** год — нарадзіўся (Латвія) Пётр Міранговіч, беларускі мастак. Скончыў Латвійскую акадэмію мастацтваў у 1937 годзе. Займаўся асветніцтвам і развіццём беларускай школы ў Латвіі. Стварыў партрэты вядомых беларускіх дзеячаў розных часоў: Я. Купалы, Ф. Скарыны, Л. Сапегі. Аўтар карцін «Над Дзвіной», «Беларускія эмігранты», «У Альпах» і іншых. Памёр у 1990 годзе.

**1932** год — 85 гадоў таму нарадзіўся (г. Мінск) Даір Слаўковіч, беларускі пісьменнік. Аўтар аповесцяў «Я вярнуся, мама!», «Алея Невядомага салдата», «Я ў рабочыя пайду» і іншых. Выдаў зборнік сатыры і гумару «Фірменны сродак».

**Было сказана**

**Пімен ПАНЧАНКА,**
**народны паэт Беларусі:**
*«Кожны год да нас прыходзіць новым,*
*Адыходзіць змрочным і старым».*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.53 | 19.11 | 12.18 |
| Віцебск — | 6.43 | 19.01 | 12.18 |
| Магілёў — | 6.43 | 19.01 | 12.18 |
| Гомель — | 6.40 | 18.57 | 12.17 |
| Гродна — | 7.09 | 19.26 | 12.17 |
| Брэст — | 7.10 | 19.26 | 12.16 |

### Месяц

***Маладзік 20 верасня.***
***Месяц у сузор'і Шаляў.***

### Імяніны

***Пр.*** *НАРАДЖЭННЕ НАЙСВЯЦЕЙШАЙ БАГАРОДЗІЦЫ. Марыі, Георгія.*
***К.*** *Аляксандра, Іпаліта, Мацея.*



Фота Ірыны СІДАРОК.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Заўзяты рыбак, адпраўляючы сына на першае спатканне, тройчы плюе ў яго на ўдачу.**

Дачка пытаецца ў маці:
— Матуля, калі я вырасту, у мяне будзе муж?
— Будзе, калі вырасцеш разумнай і добрай...
— А калі дрэннай і дурной?
— Тады ў цябе іх будзе некалькі.

**Пасля першакрасавіцкага жарту 14-гадовай дачкі «Віншую! Ты хутка станеш бабуляй!» мама спакойна заснула толькі ў наступным годзе...**

Навальніцы цяпер не тыя, што былі 20 гадоў таму: да выбуху грому дадаецца выццё сігналізацыі аўтамабіляў і лаянка з нагоды зніклага інтэрнэту...



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3518.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 20 верасня 2017 года.